ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ! ЧАЦВЕР, 5 СТУДЗЕНЯ 1939 г. № 1 (415) ЦАНА 20 КАП.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР



У прэзідыуме ўрачыстага пасяджэння, прысвечанага дваццацігоддзю БССР у Дзяржаўным Беларускім тэатры оперы і балета. НА ЗДЫМКУ — сакратары ЦК КП(б)Б тт. ПАНАМАРЭНКА і ГРЭКАВА, старшыня СНК БССР тав. КІСЕЛЕЎ, сакратар Менскага абкома КП(б)Б тав. МАТВЕЕЎ, сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета РСФСР тав. КАЗЛОЎ, намеснікі старшыні Совета Народных Камісараў БССР тт. ЗАХАРАЎ і КУЛАГІН, народны артыст СССР тав. ЛЕАНІДАЎ, прадстаўнікі Узбекскай ССР тт. КАРЫМАЎ і МІРЗАЕЎ і госці саюзных рэспублік.

Фото С. Грына.

ПАД СЦЯГАМ ЛЕНІНА—СТАЛІНА

Беларускі народ з гордасцю адсвяткаваў слаўнае дваццацігоддзе ўтварэння сваёй дзяржаўнасці.

Ідучы пад сцягам Леніна — Сталіна, ведучы бязлітасную барацьбу з шматлікімі ворагамі народа, знішчаючы іх, працоўныя Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі ў шчыльнай дружбе з усімі народамі Совецкага Саюза пабудавалі соцыялізм, дабіліся росквіту сваёй эканомікі і культуры, навукі і тэхнікі, літаратуры і мастацтва.

Як ні цяжка жылося беларускаму народу пад прыгнётам літоўскіх каралёў, нямецкіх і польскіх акупантаў, рускіх цароў, ён, свабодалюбівы беларускі народ, упэўнены ў сваёй перамозе, пранёс праз вякі сваю культуру, багацейшыя скарбніцы народнай творчасці, сваю мову.

Гісторыя ведае нямала прыкладаў, калі беларускі народ развінаў свае магутныя плечы, змагаючыся разам з рускім і украінскім народамі супроць эксплаататараў, наносячы ім зруйнавальныя ўдары.

І ў 1917 годзе беларускі народ, следам за братнім рускім народам, галасаваў за ўзброенае паўстанне. В. І. Ленін, які заўсёды быў шчыльна звязан з масамі, прыслухоўваўся да голасу мас, вучыў масы і вучыўся ад мас, сваё гістарычнае выступленне аб узброеным паўстанні на пасяджэнні Цэнтральнага Камітэта 23 (10) кастрычніка 1917 года закончыў словамі:

«Абласны з'езд і прапанову з Менска трэба выкарыстаць для пачатку рашучых дзеянняў».

Цэнтральны Камітэт комуністычнай партыі аднагалосна, супроць двух галасоў подлых здраднікаў рэволюцыі— Каменева і Зіноўева, прыняў сваё гістарычнае рашэнне аб узброеным паўстанні, якое заканчваецца так:

«Прызнаючы такім чынам, што ўзброенае паўстанне немінуча і ў поўнай меры наспела, ЦК прапануе ўсім арганізацыям партыі кіравацца гэтым і з гэтага пункту гледжання абмяркоўваць і выращаць усе практычныя пытанні (з'езда Советаў Паўночнай вобласці, вываду войск з Піцера, выступлення масквічоў і менчан і г. д.)».

Вораг народа Іуда Троцкі тады адкрыта не галасаваў супроць рашэння аб узброеным паўстанні, але ўнёс прапанову адкласці паўстанне да адкрыцця з'езда Советаў, што па сутнасці азначала поўную здраду рэволюцыі.

Беларускі народ разам з усімі народамі Совецкага Саюза пад кіраўніцтвам вялікай партыі Леніна—Сталіна ўзяў уладу ў краіне ў свае рукі. Але гэтага мала. Трэба было адстаяць яе ад імперыялістычных драпежнікаў. На Советы, акрамя ўнутранай контррэволюцыі — меншавікоў, эсэраў, бундаўцаў, буржуазных нацыяналістаў, пайшло 14 дзяржаў. Узброеныя да зубоў імперыялісты хацелі па частках разарваць рэволюцыйную Расію. Іхнім планам садзейнічаў воўк у авечай скуры— Троцкі, які наперакор дырэктыве ЦК і асабіста Леніна адмовіўся падпісаць мір з Германіяй. У Беларусь нахлынулі немцы. Іх падтрымалі беларускія нацыянал-фашысты. Катаванням і гвалтоўніцтву не было меры. Шмат патрэбна было часу, каб у карак выгнаць няпрошаных гасцей.

Працавіты беларускі народ вымушан быў стаць пад ружжо. Ён паслаў сваіх лепшых сыноў у Чырвоную Армію — для абароны радзімы, бацькаўшчыны працоўных усяго свету.

Следам за немцамі захацелі паспытаць беларускага сала і каўбас палякі, несучы за сабою гора і пакуты для працоўных. Чырвоная Армія і партызаны беларускіх лясоў добра травучы лі фанабэрыстых польскіх паноў, частуючы іх свінцом і снарадамі. Больш ніколі хілай Польшчы не ўладаць нашай зямлёй, а польскім панам — не есці нашых смачных калгасных каўбас! Беларусы — народ мірны, але хто з мечам да іх прыдзе, ад меча і загіне. Няхай гэта ведаюць фашысты.

Вялікі Сталін заўсёды высока цаніў беларускі народ, па-бацькоўску клапоцячыся аб ім, кіруючы барацьбой беларускага народа за Совецкую ўладу.

І нават тады, калі беларускі народ быў давядзен царскімі апрычнікамі, нямецкімі і польскімі акупантамі да абнішчання, ён апошнім, што меў, дзяліўся з чырвонаармейцамі, якія ў годы грамадзянскай вайны часта галадалі, былі разутымі і раздзетымі.

«Такіх адносін, — пісаў таварыш Сталін у газеце «Красноармеец» ад 15 ліпеня 1920 года, — мне не прыходзілася сустракаць ні на ўсходзе, ні на поўдні. Не гледзячы на беднасць сялянскіх мас на Захадзе ў параўнанні з Паволжжам і Поўднем, усё-ж сяляне дзяліліся апошнім з чырвонаармейцамі. Насельніцтва прыфронтавай паласы перанесла ўвесь цяжар польскай акупацыі, таму вельмі добра ўсведамляла, чым пагражае яму ўтаржэнне польскіх паноў.

На нашым фронце ёсць цэлая група войск, уся санітарная справа якой знаходзіцца ў руках сялян і сялянак, праяўляючых найвялікшыя клопаты і ўвагу да нашых параненых чырвонаармейцаў...

Што датычыць настрою беларускіх сялян за франтавой паласой, то па нашых вестках там адбываюцца суцэльныя паўстанні, працуюць партызанскія атрады, якія разбураюць тыл праціўніка, спальваючы склады і знішчаючы памешчыкаў...»

БССР утварылі вялікія Ленін і Сталін. Комуністычная партыя, рускі народ аказалі беларускаму народу вялікую дапамогу. За годы двух сталінскіх пяцігодак БССР ператворана ва ўзорную ордэнаносную рэспубліку.

Свята БССР стала ўсенародным святам Саюза Советаў. Цэнтральны Камітэт ВКП(б), СНК СССР, братнія рэспублікі горача віталі беларускі народ з перамогамі як на гаспадарчым фронце, так і на фронце культуры.

Квітнее мастацтва Совецкай Беларусі. Пастаноўкай п'есы «Чалавек з ружжом» тэатральнае мастацтва БССР прадэманстрыравала сваю спеласць. Цяпер наша мастацтва ўступіла ў новы, найбольш адказны перыяд. Працаўнікам мастацтваў трэба апраўдаць высокія званні, нададзеныя ім урадам БССР у сувязі з дваццацігоддзем рэспублікі. Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР павінна ўзначаліць уздым артыстаў, мастакоў, кампазітараў, усяго фронта мастацтваў з тым, каб паказаць у мастацтве ўсю веліч эпохі Леніна—Сталіна.

Павышаныя патрабаванні наш народ прад'яўляе і да беларускай літаратуры. Мы выйшлі з юнацкага ўзросту. За гэты час у нас выраслі дзесяткі талентаў, да канца адданых вялікай партыі Леніна—Сталіна. Сярод іх такія імёны, як Янка Купала і Якуб Колас, як М. Лынькоў, З. Бядуля і К. Крапіва, як П. Броўка, П. Глебка, І. Шпілаваў, Эд. Самуйлёнак, А. Куляшоў і інш. Нашым пісьменнікам патрэбна стварыць шырокія мастацкія палатны, у якіх паказаць гіганцкую барацьбу рабочых, сялян і інтэлігенцыі Совецкай Беларусі за пабудову соцыялізма, за ператварэнне заходніх рубяжоў нашай радзімы ў непрыступную крэпасць.

Пад сцягам Леніна—Сталіна мы ўзялі ўладу ў свае рукі, пад сцягам Леніна—Сталіна перамаглі ў годы грамадзянскай вайны, пад сцягам Леніна—Сталіна пабудавалі соцыялізм, пад сцягам Леніна—Сталіна пойдзем наперад да новых перамог — пабудовы комунізма.

Няхай жыве непераможны сцяг Леніна—Сталіна!

ПРЭЗІДЫУМУ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР СОВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР ЦЭНТРАЛЬНАМУ КАМІТЭТУ КОМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ (большэвікоў) БЕЛАРУСІ

Совет Народных Камісараў Саюза ССР і Цэнтральны Камітэт Усесаюзнай Комуністычнай партыі (большэвікоў) вітаюць рабочых, калгаснікаў, інтэлігенцыю і ўсіх працоўных Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі з дваццацігоддзем устанаўлення Совецкай улады ў Беларусі і вызвалення беларускага народа ад нацыянальнага гнёту.

З прыгнечанай, адсталай правінцыі царскай Расіі, знаходзіўшайся пад гнётам польскіх, рускіх і беларускіх памешчыкаў і капіталістаў, а ў годы грамадзянскай вайны адчуўшай цяжар інтэрвенцыі германскіх і польскіх полчышч, — Совецкая Беларусь пад кіраўніцтвам партыі большэвікоў да дня свайго дваццацігадовага юбілея вырасла і развілася ва ўзорную Совецкую Рэспубліку, у перадавы атрад краіны соцыялізма на Захадзе.

За прайшоўшыя 20 год працоўныя Совецкай Беларусі дабіліся вялікіх поспехаў ва ўсіх галінах соцыялістычнага будаўніцтва. Створаны новыя фабрыкі і заводы, сельская гаспадарка стала буйнай калгаснай, механізаванай, расце нацыянальная беларуская культура, усё вышэй узнімаецца культурны ўзровень рабочых, калгаснікаў і ўсіх працоўных, расце іх дабрабыт.

Гэтыя поспехі дасягнуты працоўнымі Совецкай Беларусі ва ўпорнай барацьбе з буржуазнымі нацыяналістамі і трацкісцка-бухарынскімі шпіёнамі і дыверсантамі, якія прабавалі вярнуць свабодны беларускі народ пад ярмо капіталістаў і нацыянальнага гнёту. Працоўныя Совецкай Беларусі пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі разграмілі гэтыя варожыя гнёзды.

Совет Народных Камісараў СССР і Цэнтральны Камітэт ВКП(б) выражаюць цвёрдую ўпэўненасць, што беларускі народ будзе і надалей, на аснове правядзення Ленінскай нацыянальнай палітыкі, нястомна працаваць над далейшым умацаваннем Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.

СНК САЮЗА ССР.
ЦК ВКП(б).

ПРЫВІТАННЕ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР віншуе працоўных Совецкай Беларусі з днём слаўнай гадавіны — дваццацігоддзем Беларускай ССР.

У дружнай сям'і народаў СССР працоўныя Беларусі займаюць адно з ганаровых месц у будаўніцтве і ўмацаванні першай у свеце соцыялістычнай дзяржавы рабочых і сялян.

На аснове паслядоўнага правядзення ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, у барацьбе са здраднікамі радзімы — трацкісцка-бухарынскімі і буржуазна-нацыяналістычнымі агентамі фашызма, працоўныя Беларусі пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі дабіліся велізарных поспехаў у справе гаспадарчага і культурнага будаўніцтва рэспублікі, умацавання абароннай магутнасці СССР.

Выказваем упэўненасць, што рабочыя, калгаснікі і інтэлігенцыя Беларусі, уступаючы ў дваццаць першую гадавіну існавання рэспублікі, прыкладуць усе свае сілы ў барацьбе за далейшы гаспадарчы і культурны росквіт Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі — магутнага фарпоста СССР на Захадзе — і разам з усімі народамі Совецкага Саюза пад сцягам Сталінскай Канстытуцыі ўпэўнена пойдуць да канчатковай перамогі комунізма.

СТАРШЫНЯ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР
М. КАЛІНІН.
САКРАТАР ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР
А. ГОРКІН.

31 снежня 1938 г.

Цэнтральнаму Камітэту КП(б) Беларусі Вярхоўнаму Совету БССР

У дзень 20-й гадавіны Совецкай Беларусі шлю маё гарачае чырвонаармейскае прывітанне і віншаванні рабочым, калгаснікам і совецкай інтэлігенцыі.

Асобае прывітанне маім выбаршчыкам — працоўным Менскай выбарчай акругі.

Свой 20-гадовы юбілей працоўныя Беларусі святкуюць у абстаноўцы велізарнейшых дасягненняў у соцыялістычным і культурным будаўніцтве.

Заўсёды арганізаваны і працалюбівы беларускі народ вылучыў многія тысячы стаханаўцаў заводаў і соцыялістычных палёў, сапраўдных будаўнікоў соцыялізма. Працоўныя Совецкай Беларусі слаўнымі справамі даказалі сваю вернасць ідэалам вялікай партыі **Леніна — Сталіна.**

Усяму свету вядома, што Совецкая Беларусь разам з усім Совецкім Саюзам змагаецца за справу міру, але, як і ўвесь совецкі народ, працоўныя Совецкай Беларусі сумесна са сваёй Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміяй заўсёды гатовы біцца за соцыялізм, за сваю незалежнасць і разграміць усіх і ўсялякіх сваіх злейшых і хваслівейшых ворагаў.

Няхай жывуць працоўныя Совецкай Беларусі!

Няхай жыве совецкі народ!

К. ВАРАШЫЛАЎ.

31 снежня 1938 года.

МАСКВА, КРЭМЛЬ

Таварышу СТАЛІНУ

У гістарычны дзень XX-годдзя ўтварэння Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі беларускі народ шле сваё палкае прывітанне Вам, наш вялікі правадыр, родны і любімы таварыш **Сталін.**

Беларускі народ ніколі ў гісторыі не меў сваёй дзяржаўнасці. На працягу ўсёй сваёй дарэволюцыйнай гісторыі гарады і сёлы Беларусі падвяргаліся спусташэнню і разарэнню з боку нямецкіх псоў-рыцараў і татарскіх полчышчаў, беларускі народ грабілі і жорстка прыцяснялі літоўскія феадалы, польскія паны і царскія апрычнікі. Цемра і прыгнечанне, хваробы і выміранне—такі быў лёс працоўнага беларуса да рэволюцыі.

Але гэта змрочнае жыццё пайшло ў далёкае беззваротнае мінулае.

У рэзультаце перамогі Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, пад кіраўніцтвам слаўнай большэвіцкай партыі, пры непасрэдным удзеле вялікага Леніна і Вашым, таварыш Сталін, рабочыя і сяляне Беларусі набылі сваю соцыялістычную дзяржаўнасць, набылі права на працу, адукацыю і на забяспечанае, шчаслівае і раднаснае жыццё.

Вось чаму працоўныя Беларусі звязваюць з Вашым іменем незалежнасць і свабоду сваёй краіны, вось чаму яны поўны глыбокай прызнацельнасці і глыбокай любві да Вас— вялікага саратніка і прадаўжальніка справы геніяльнага **Леніна.**

У вяках будзе жыць памяць аб тых гістарычных днях, калі Вы, па заданню Леніна, распрацавалі і ажыццявілі геніяльны план разгрому нямецкіх акупантаў і белапольскіх захватчыкаў, калі натхнёная Вамі, непераможная армія соцыялізма ў цесным еднанні з працоўнымі Беларусі, пры падтрыманні брацкага рускага народа назаўсёды ачысціла гарады і сёлы БССР ад белапольскіх акупантаў і іх буржуазна-нацыяналістычных прыхвасняў.

Тройчы прэзрэнныя трацкісцка-бухарынскія і нацыяналістычныя агенты фашызма па заданню сваіх германа-польскіх гаспадароў прабавалі адторгнуць БССР ад вялікага Совецкага Саюза і вярнуць яе пад ярмо буржуазна-памешчыцкай кабалы. Але яны жорстка праличыліся. Пад Вашым непасрэдным кіраўніцтвам і пры гарачым падтрыманні ўсяго беларускага народа совецкая разведка разграміла асіныя гнёзды ворагаў.

Беларускі народ назаўсёды звязаў свой лёс з лёсам народаў вялікага Совецкага Саюза. Сталінская дружба народаў СССР моцна, як граніт.

Мудрая ленінска-сталінская нацыянальная палітыка, Вашы, таварыш Сталін, бацькоўскія клопаты аб шчасці працоўных прывялі БССР да яркага гаспадарчага і культурнага росквіту. Светлае і радаснае наша жыццё— жыццё, поўнае творчасці і шчасця, жыццё адухатворанай раднаснай працы на карысць нашай вялікай радзімы. Да гэтага шчаслівага жыцця наш народ, як і ўсе народы нашай радзімы, прышоў пад сцягам Леніна—Сталіна, пад Вашым геніяльным кіраўніцтвам. І магутнае сэрца нашага народа б'ецца ў [illegible] і адданасці Вам, наш мудры правадыр, наш родны бацька і настаўнік.

Мы заўсёды памятаем Ваша мудрае ўказанне аб капіталістычным акружэнні, аб тым, што трэба ўвесь наш народ трымаць у стане пастаяннай мабілізацыйнай гатоўнасці, трымаць порах сухім перад тварам фашысцкай небяспекі вайны. Знаходзячыся на рубяжы з капіталістычным Захадам, беларускі народ пільна стаіць на варце кастрычніцкіх заваяванняў, мабілізуючы ўсе сілы, усю сваю жалезную волю, усю сваю кіпучую энергію для новых перамог соцыялізма.

І калі вораг асмеліцца на нас напасці, мы будзем бязлітасна яго біць на той тэрыторыі, адкуль ён прыдзе, да канца, да поўнага яго знішчэння.

Вялік, магутны і непераможны совецкі народ, згуртаваны вакол Усесаюзнай Комуністычнай партыі (большэвікоў), вакол вялікага, роднага і любімага правадыра—таварыша Сталіна.

Няхай жыве сталінскае сузор'е брацкіх Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік!

Няхай жыве наша слаўная непераможная партыя Леніна—Сталіна!

Няхай жыве мудры правадыр працоўнага чалавецтва, натхніцель і арганізатар перамог соцыялізма, тварэц беларускай совецкай дзяржаўнасці, лепшы друг беларускага народа—наш вялікі **Сталін!**

УКАЗ
Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР
Аб прысваенні звання заслужанага артыста БССР у сувязі з 20-годдзем Беларускай ССР

У азнаменаванне 20-годдзя Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі і за выдатныя заслугі ў галіне совецкага сцэнічнага мастацтва, прысвоіць званне **заслужанага артыста БССР:**

1. **Балоціну** Ізраілю Рувімавічу—артысту Беларускага Дзяржаўнага тэатра оперы і балета.

2. **Грыгонісу** Генрыху Юльевічу—артысту 1-га Беларускага Дзяржаўнага драматычнага тэатра.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР Н. НАТАЛЕВІЧ.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР Л. ПАПКОЎ.

3 студзеня 1939 г. г. Менск.

УКАЗ
Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР
Аб узнагародзе Ансамбля песні і пляскі Беларускай Дзяржаўнай Філармоніі ў сувязі з 20-годдзем Беларускай ССР

У азнаменаванне 20-годдзя Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі за выдатныя поспехі ў справе развіцця беларускай народнай творчасці музыкі, песні і пляскі ўзнагародзіць Ансамбль песні і пляскі Беларускай Дзяржаўнай Філармоніі — **Ганаровай граматай Вярхоўнага Совета БССР.**

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР Н. НАТАЛЕВІЧ.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР Л. ПАПКОЎ.

3 студзеня 1939 г. г. Менск.

20 год стварэння Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі

МАСКВА, ЦК ВКП(б)

Працоўныя сталіцы ордэнаноснай Совецкай Беларусі ў дзень слаўнага XX-годдзя з дня утварэння Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі ад імя ўсяго беларускага народа шлюць сваё шчырае, гарачае большэвіцкае прывітанне слаўнаму арганізатару перамог соцыялізма ў нашай краіне, баявому штабу герaічнай партыі большэвікоў — Ленінска-Сталінскаму Цэнтральнаму Камітэту Усесаюзнай Комуністычнай партыі (большэвікоў).

Сёння, у гэты радасны дзень, дзень народнай урачыстасці, працоўныя Совецкай Беларусі з пачуццём найвялікшай радасці і гордасці адзначаюць велізарныя перамогі соцыялізма, атрыманыя ў адзінай дружнай сям'і вялікага Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік.

Многія стагоддзі беларускі народ жыў пад гнётам польскіх паноў, зверска эксплаатаваўся і прыгнятаўся памешчыкамі і капіталістамі, адчуваў увесь цяжар палітычнага і нацыянальнага бяспраўя пры царскім самадзяржаўі. І толькі ў рэзультаце Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, у рэзультаце перамог партыі Леніна—Сталіна беларускі народ атрымаў сваю дзяржаўнасць, заваяваў шчаслівае, радаснае жыццё.

Сапраўды выдатны шлях, пройдзены беларускім народам за гэтыя 20 год. Ад маленькіх поўсаматужных прадпрыемстваў, якія славіліся звярынай эксплаатацыяй, патагоннай работай, да буйнейшых соцыялістычных фабрык і заводаў — такі шлях нашай прамысловасці.

Ад вузкай і ўбогай палоскі селяніна-бедняка да неабсяжных прастораў квітнеючай калгаснай зямлі, ад старажытнай сахі да трактара і камбайна, — такі шлях нашай сельскай гаспадаркі.

Ад поўразбуранай і рэдкай школкі да дзесяткаў вышэйшых навучальных устаноў, соцень сярэдніх школ, Акадэміі навук, тэатраў, незлічоных клубаў, соцень газет, тысяч выдаючыхся кніг, кіно, мастацкай самадзейнасці і т. д., і т. п. — такі шлях беларускага працоўнага ў будаўніцтве магутнай культуры, нацыянальнай па форме, соцыялістычнай па зместу.

З нянавісцю ўспамінаюць працоўныя Совецкай Беларусі сваё далёкае і нядаўняе мінулае: насілле з боку польскай шляхты, праследванні рускім царызмам, крывавыя жахі імперыялістычнай вайны, разбойніцкія набегі кайзераўскіх і белапольскіх акупантаў. Усё гэта ў мінулым.

Доўгія годы выпрабаванняў не зламілі мужнасці народа, не зламілі яго волі да барацьбы за сваё будучае, да барацьбы за палітычнае і нацыянальнае вызваленне. Праз вякі герaічны беларускі народ пранёс сцяг барацьбы за сваю незалежнасць, за роўнапраўе, за народнае шчасце. І пры вялікай дапамозе герaічнага рускага рабочага класа, усяго рускага народа, пад кіраўніцтвам нашай слаўнай партыі Леніна—Сталіна беларускі народ скінуў з сябе векавое рабства, канчаткова і беспаваротна расправіўся з усімі сваімі прыгнятальнікамі і насільнікамі, пабудаваў радаснае, шчаслівае соцыялістычнае жыццё.

Лепшыя сыны партыі кіравалі намі і дапамагалі нам. Владзімір Ільіч Ленін, Іосіф Вісарыёнавіч Сталін — вось каго лічым мы сапраўднымі стваральнікамі нашай дзяржаўнасці, нашага шчасця, нашага роўнапраўя. Мы ніколі не забудзем велізарнай дапамогі нашаму народу ў барацьбе за Совецкую Беларусь лепшых вучняў і верных саратнікаў В. І. Леніна і таварыша Сталіна — Калініна, Свердлова, Фрунзе, Кагановіча, Орджанікідзе і Ежова.

І зараз мы штодзень адчуваем найвялікшыя клопаты, велізарную дапамогу Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) у далейшай барацьбе за пабудову комунізма ў нашай краіне.

У дзень найвялікшай нашай радасці, звяртаючы свае думкі гарачай любві і аддансці Цэнтральнаму Камітэту ВКП(б), нашаму дарагому правадыру і настаўніку таварышу Сталіну, мы абяцаем:

Высока трымаць непераможны сцяг Леніна — Сталіна над квітнеючай і раснай зямлёй Беларусі.

Яшчэ больш згуртавацца вакол Комуністычнай партыі большэвікоў.

Умацоўваць асновы сталінскай дружбы народаў Совецкага Саюза.

Бязлітасна змятаць з зямлі Советаў ворагаў партыі і народа — трацкісцка-бухарынскую нечысць, нацыянал-фашысцкую, шпіёнскую і дыверсанцкую мразь.

Пільна ахоўваць рубяжы нашай выдатнай радзімы, граніцы вялікага Совецкага Саюза, любоўна дапамагаць нашай слаўнай Чырвонай Арміі быць гатовымі даць бязлітасны адпор ворагу і граміць яго на яго-ж тэрыторыі.

Усе сілы і волю сваю аддаць вялікай справе комунізма.

Няхай жыве ордэнаносная БССР!

Няхай жыве баявы штаб соцыялістычных перамог — Цэнтральны Камітэт Усесаюзнай комуністычнай партыі (большэвікоў)!

Няхай жыве любімы правадыр, друг і настаўнік Іосіф Вісарыёнавіч **Сталін!**

МАСКВА, КРЭМЛЬ

Вячэславу Міхайлавічу МОЛАТАВУ

Дарагі Вячэслаў Міхайлавіч!

У дзень свайго радаснага свята — XX-годдзя БССР—беларускі народ шле Вам — главе Совецкага ўрада—сваё палкае большэвіцкае прывітанне.

20 год таму назад вялікія правадыры працоўнага чалавецтва Ленін і Сталін стварылі Беларускую Совецкую Соцыялістычную Рэспубліку.

Вякамі прыгнятаемы польскімі панамі, рускімі і беларускімі капіталістамі, беларускі народ пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна, пры дружнай і брацкай дапамозе вялікага рускага народа і ўсіх працоўных краіны Советаў заваяваў сабе дзяржаўнасць. 20 год беларускі народ пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна будуе новае, шчаслівае, радаснае жыццё.

За гэты час беларускім народам пройдзен велізарны шлях барацьбы і перамог. З адсталай у мінулым калоніі царскага самадзяржаўя Беларусь ператварылася ў квітнеючую соцыялістычную індустрыяльна - калгасную рэспубліку. У сузор'і совецкіх соцыялістычных рэспублік вялікага Совецкага Саюза ярка свеціць свабодная Совецкая Соцыялістычная ордэнаносная Беларусь.

Няўхільнае ажыццяўленне ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі забяспечыла росквіт усіх галін народнай гаспадаркі, культуры і добрабыту працоўных мас БССР.

Беларуская рэспубліка — магутны фарпост Совецкага Саюза на яго заходніх рубяжах з капіталістычным светам. Беларускі народ несакрушымай сцяной разам з любімай і непераможнай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміяй, разам са слаўнымі пагранічнікамі зорка стаіць на ахове совецкіх граніц. Сёння ён яшчэ раз горда і ўпэўнена заяўляе: «Дорага паплоціцца вораг, калі пасмее ступіць на нашу свяшчэнную совецкую зямлю. Ён будзе разгромлен на яго-ж уласнай тэрыторыі».

Рука аб руку з працоўнымі Совецкага Саюза, пад пераможным сцягам партыі Леніна—Сталіна ідзе беларускі народ да заветнай мэты—да комунізма.

Прэзрэнная трацкісцка-бухарынская і нацыянал-фашысцкая агентура замежнага капітала хацела прадаць у кабалу фашысцкім бандытам працоўных СССР, у тым ліку і беларускі народ. Але гады пралічыліся. Беларускі народ, таксама як і ўсе народы Совецкага Саюза, бязлітасна знішчыў і надалей будзе знішчаць усіх тых, хто пасмее пасягнуць на шчасце і радасць совецкага народа, на вялікія заваяванні Кастрычніка.

Сэрцы працоўных Совецкай Беларусі поўны шчырай удзячнасці ЦК ВКП(б), вялікаму Сталіну, ураду Саюза ССР і асабіста Вам, Вячэслаў Міхайлавіч, за ўвагу і дапамогу нашай рэспубліцы ў яе гаспадарчым і культурным будаўніцтве.

Сёння — ва ўрачыстае свята XX-годдзя БССР — пачуцці і думкі беларускага народа звернуты да вялікай партыі большэвікоў, да любімага правадыра і друга беларускага народа Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна, да Вас — вернага і баявога яго саратніка. Мы запэўняем партыю і ўрад, што заўсёды будзем горда несці вялікі сцяг Леніна—Сталіна і пад гэтым сцягам прыдзем да поўнай перамогі комунізма.

Няхай жыве сталінская дружба народаў Совецкага Саюза!

Няхай жыве вялікі, непераможны рускі народ!

Няхай жыве саюзны ўрад і яго глава таварыш **Молатаў!**

Няхай жыве Усесаюзная Комуністычная партыя (большэвікоў) і яе правадыр, геній чалавецтва, вялікі **Сталін!**



Дэлегацыя РСФСР, прыбыўшая ў Менск на святкаванне 20-годдзя БССР.

НА ЗДЫМКУ: злева направа, у першым раду: народны артыст Саюза ССР, двойчы ордэнаносец Л. М. Леанідаў, сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета РСФСР Г. В. Казлоў і дэпутат Вярхоўнага Совета РСФСР ткачыха-стаханаўка Е. В. Масленнікава. У другім раду: дэпутат Вярхоўнага Совета РСФСР — прафесар матэматыкі С. Л. Собалеў, старшыня калгаса «Работнік», Маскоўскай вобл. Д. М. Рыбакоў і інжынер-тэхнолаг ордэнаносец И. А. Гаўрылаў.

Фота Л. Мазелева (БЕЛТА).

ПРЫВІТАННІ ПРАЦОЎНЫМ БССР

Ад РСФСР

У дзень дваццацігоддзя Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі Прэзідыум Вярхоўнага Совета РСФСР, ад імя працоўных Расійскай Совецкай Федэратыўнай Соцыялістычнай Рэспублікі, шле братняе гарачае прывітанне працоўным Совецкай Беларусі.

Дваццаць год таму назад, пад кіраўніцтвам партыі Леніна — Сталіна, рабочыя і сяляне Беларусі, назаўсёды вызваліўшыся ад нацыянальнага гнёту царызма і рускай імперыялістычнай буржуазіі, разграмілі беларускую нацыяналістычную контррэволюцыю і стварылі соцыялістычную дзяржаву рабочых і сялян—Беларускую Совецкую Соцыялістычную Рэспубліку.

Ажыццяўляючы ленінска - сталінскую нацыянальную палітыку, працоўныя Совецкай Беларусі за прайшоўшы перыяд дасягнулі высокага ўзроўню ў развіцці народнай гаспадаркі, культуры і на аснове вялікай Сталінскай Канстытуцыі будуюць заможнае культурнае і шчаслівае жыццё.

Прэзідыум Вярхоўнага Совета РСФСР выказвае ўпэўненасць, што працоўныя Совецкай Беларусі і надалей будуць высока трымаць сцяг барацьбы за непарушнасць братняга саюза народаў СССР, за ўмацаванне абароназдольнасці і недатыкальнасці граніц нашай вялікай соцыялістычнай радзімы, за поўную перамогу комунізма.

Няхай жыве шчаслівы беларускі народ і ўсе народы вялікага Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік!

Няхай жыве вялікі правадыр народаў, наш любімы Сталін!

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета РСФСР А. БАДАЕЎ.
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета РСФСР Г. КАЗЛОЎ.

Ад Украінскай ССР

У дзень XX-годдзя Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі Прэзідыум Вярхоўнага Совета УССР ад імя працоўных соцыялістычнай Украіны шле брацкае палкае прывітанне працоўным Совецкай Беларусі.

Пад кіраўніцтвам партыі Леніна — Сталіна працоўныя Совецкай Беларусі разграмілі трацкісцка-бухарынскіх і буржуазна-нацыяналістычных агентаў замежнага фашызма і, пры дапамозе вялікага рускага народа, пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі, на аснове ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, за годы рэволюцыі дасягнулі высокага ўзроўню ў развіцці соцыялістычнай гаспадаркі і культуры.

Прэзідыум Вярхоўнага Совета УССР выражае ўпэўненасць, што працоўныя Совецкай Беларусі і надалей будуць бязлітасна змагацца за канчатковае і поўнае выкараненне ворагаў народа, за далейшае ўмацаванне сталінскай дружбы народаў СССР, за далейшае ўмацаванне абароназдольнасці, магутнасці нашай вялікай радзімы — СССР, за поўную перамогу комунізма.

Няхай жыве вялікая партыя Леніна — Сталіна!

Няхай жыве герaічны беларускі народ!

Няхай жыве наша магутная, выдатная, любімая радзіма — Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік!

Няхай жыве вялікі правадыр партыі і народаў СССР таварыш Сталін!

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета УССР Л. КАРНІЕЦ.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета УССР А. МЕЖЖЭРЫН.

Ад Грузінскай ССР

У дваццатую гадавіну вызвалення слаўнага беларускага народа Прэзідыум Вярхоўнага Совета Грузінскай ССР шле братняе прывітанне працоўным Беларускай ССР.

Да Вялікай Кастрычніцкай рэволюцыі беларускі народ быў заняволен прыгнятальнікамі. Беларускі народ на працягу вякоў цярпеў пакуты і прыніжэнне, усякае імкненне да свабоды, да творчасці бязлітасна падаўлялася ў ім рускімі царамі, польскімі і беларускімі памешчыкамі і капіталістамі. Імперыялістычная бойня яшчэ больш узмацніла пакуты беларускага народа, але рускі рабочы клас пад кіраўніцтвам слаўнай большэвіцкай партыі, пад вадзіцельствам найвялікшых правадыроў—Леніна і Сталіна зрабіў Вялікую соцыялістычную рэволюцыю і вызваліў назаўсёды працоўных усіх народаў былой царскай Расіі ад гнёту і эксплаатацыі, гэтым самым быў вырашан і лёс беларускага народа.

Але патрэбавалася яшчэ найвялікшае напружанне ўсіх яго сіл для выгнання нямецкіх акупантаў, устанаўлення Совецкай улады і ўмацавання дыктатуры пролетарыята з дапамогай вялікага рускага народа. Пад кіраўніцтвам партыі большэвікоў беларускі народ цвёрда, без хістанняў ішоў па шляху, акрэсленаму Леніным і Сталіным, да сапраўднага адраджэння сваёй дзяржаўнасці, гаспадаркі і культуры. Ворагі народа і партыі — трацкісцка-бухарынскія бандыты і буржуазна-нацыяналістычныя контррэволюцыянеры за ўсе гэтыя годы не раз спрабавалі зноў закабаліць беларускі народ, прадаць Беларусь фашысцкім драпежнікам, але пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі беларускі народ змог выкрыць і знішчыць асноўныя гнёзды гнусных здраднікаў і шпіёнаў.

Совецкая Беларусь стала адной з перадавых рэспублік вялікага Совецкага Саюза, яна стварыла магутную соцыялістычную індустрыю і квітнеючую соцыялістычную сельскую гаспадарку. Працоўныя Беларусі жывуць шчаслівым, радасным жыццём. У Совецкай Беларусі расцвілі навука, літаратура, мастацтва, крыніцай забіла культурнае жыццё, паявіліся выйшаўшыя з нетраў народа таленавітыя паэты, мастакі, вучоныя, перадавыя людзі працы — стаханаўцы.

Працоўныя Совецкай Беларусі не забываюць мудрых слоў таварыша Сталіна аб тым, што мы абкружаны ворагамі. Яны пільна аберагаюць свяшчэнныя граніцы Совецкага Саюза і гатовы ў кожную мінуту адбіць напад ворага. Сёнешняя ўрачыстасць беларускага народа з'яўляецца ўрачыстасцю ўсіх народаў нашага вялікага Саюза. У гэты ўрачысты дзень увесь беларускі народ яшчэ больш згуртуецца вакол вялікага, непераможнага сцяга Маркса — Энгельса — Леніна — Сталіна.

Няхай жыве Совецкая Соцыялістычная Беларусь!

Няхай жыве сталінская дружба народаў!

Няхай жыве партыя Леніна—Сталіна!

Няхай жыве вялікі Сталін!

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета Грузінскай ССР Ф. МАХАРАДЗЕ.

Ад Таджыкскай ССР

Ад імя працоўных Таджыкістана Прэзідыум Вярхоўнага Совета Таджыкскай ССР віншуе герaічны беларускі народ з дваццацігадовым юбілеем існавання Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі. Беларускі народ пад кіраўніцтвам партыі Леніна — Сталіна прайшоў слаўны шлях барацьбы і перамог. За гістарычна кароткі тэрмін ён пры дапамозе вялікага рускага народа разграміў асіныя гнёзды агентаў фашызма і дабіўся найвялікшых поспехаў па будаўніцтву соцыялізма.

Мы ўпэўнены, што беларускі народ пад кіраўніцтвам правадыра працоўных таварыша Сталіна праявіць яшчэ больш энтузіязма па будаўніцтву комунізма і ўмацаванню вялікай сталінскай дружбы народаў, якая з'яўляецца вернай гарантыяй далейшага росту магутнасці і працвітання народаў нашай горача любімай цудоўнай радзімы — Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік.

Няхай жыве несакрушымая партыя Леніна — Сталіна!

Няхай жыве наш правадыр—вялікі Сталін!

Няхай жыве наша магутная радзіма — Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік!

Няхай жыве герaічны беларускі народ!

СТАРШЫНЯ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА ТАДЖЫКСКАЙ ССР ШАГАДАЕЎ.

Ад Туркменскай ССР

Прэзідыум Вярхоўнага Совета Туркменскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі горача вітае і віншуе беларускі народ у дзень дваццатай гадавіны ўтварэння Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі. Соцыялістычная Туркменія глыбока ўпэўнена, што ў братняй сям'і народаў Совецкага Саюза Беларуская Совецкая Рэспубліка — на аснове вялікай Сталінскай Канстытуцыі, пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, пры дапамозе рускага народа — яшчэ з большымі поспехамі будзе развіваць свае прадукцыйныя сілы, да канца разгроміць подлых агентаў фашызма і пойдзе па шляху перамог да комунізма.

Няхай жыве вялікая дружба і братэрства народаў Саюза ССР!

Няхай жыве ленінска-сталінская нацыянальная палітыка!

Няхай жыве Усесаюзная Комуністычная партыя (большэвікоў)!

Няхай жыве любімы правадыр народаў СССР таварыш Сталін!

СТАРШЫНЯ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА ТУРКМЕНСКАЙ ССР ДЗІНАЛІ БАБАЕЎ.

МАСКВА, КРЭМЛЬ

Міхаілу Іванавічу КАЛІНІНУ

Дарагі Міхаіл Іванавіч!

У радасны дзень 20-й гадавіны ўтварэння БССР працоўныя Совецкай Беларусі шлюць Вам, слаўнаму саратніку вялікага Сталіна, палкае большэвіцкае прывітанне.

20 год таму назад беларускі народ з найвялікшай радасцю сустрэў ленінска-сталінскі маніфест аб утварэнні Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі. Гэта быў дакумент, абвясціўшы на ўвесь свет, што беларускі народ, які вякамі стагнаў пад гнётам польскіх, літоўскіх і беларускіх паноў, пад цяжкім ігам царскага самадзяржаўя, атрымлівае сваю дзяржаўнасць. Гэта быў дакумент, агаласіўшы на ўвесь свет, што ў мінулым забітая і прыгнечаная калонія царызма ператварылася ў свабодную і роўнапраўную Совецкую Соцыялістычную Рэспубліку.

Гэта стала магчымым толькі ў рэзультаце перамогі Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, таржаства ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, дзякуючы кіраўніцтву большэвіцкай партыі і яе правадыроў Леніна і Сталіна.

Лютыя ворагі соцыялізма прабавалі задушыць маладую Совецкую Рэспубліку, зноў надзець на шыю рабочых і сялян ярмо капіталістычнай эксплаатацыі. Мы перажылі нямецкую і белапольскую акупацыі. Са зброяй у руках, кіруемы і натхняемы Леніным і Сталіным, біўся беларускі народ разам з усімі народамі вялікай соцыялістычнай Радзімы супроць інтэрвентаў за сваю свабоду, за сваю незалежнасць. Мы ніколі не забудзем, дарагі Міхаіл Іванавіч, якую велізарную дапамогу аказалі Вы беларускаму народу ў цяжкія годы грамадзянскай вайны. Мы не забудзем, як Вы прыязджалі да нас і мабілізавалі беларускі народ на барацьбу за вызваленне БССР ад імперыялістычных захватчыкаў. Ачышчэннем нашай зямлі ад белапольскіх акупантаў, ад нацыянал-фашысцкай агентуры капіталізма мы абавязаны большэвіцкай партыі, вялікім правадырам працоўных Леніну і Сталіну і Вам—іх бліжэйшаму саратніку, другу беларускага народа.

Вашы неаднаразовыя прыезды ў Беларусь былі велізарнай дапамогай нашаму народу ў аднаўленні разбуранай народнай гаспадаркі, у пасняховым будаўніцтве соцыялізма. У 1935 годзе беларускі народ прыняў з Вашых рук вышэйшую ўзнагароду—ордэн Леніна, якім ён ганарыцца, і які з гонарам носіць на сваім сцягу.

З пачуццём радасці і гордасці мы расказваем Вам цяпер аб нашых выдатных перамогах на ўсіх участках соцыялістычнага будаўніцтва. Воляй партыі большэвікоў, дзякуючы штодзенным клопатам вялікага друга беларускага народа, любімага правадыра і настаўніка — таварыша Сталіна Беларусь, пры дапамозе брацкіх народаў СССР і, у першую чаргу, вялікага рускага народа, расквітнела, як пышны сад, ператварылася ў квітнеючую індустрыяльна-аграрную рэспубліку з першакласнай соцыялістычнай прамысловасцю, з перадавой калектывізаванай сельскай гаспадаркай, з высока развітай культурай, нацыянальнай па форме, соцыялістычнай па зместу. Сотні і тысячы вучоных, пісьменнікаў, інжынераў, лётчыкаў, мастакоў, урачоў, дзяржаўных дзеячоў дае наш народ радзіме, вялікаму Совецкаму Саюзу. Есць чым і ёсць кім ганарыцца беларускаму народу. Пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі працоўныя БССР жывуць радасна, культурна і заможна.

Наша шчасце, нашу радасць, наша выдатнае жыццё хацелі адабраць у нас прэзрэнныя ворагі народа—трацкісцка-бухарынская і нацыянал-фашысцкая банда германскіх і польскіх шпіёнаў. Яны хацелі адарваць Совецкую Беларусь ад яе мацеры—вялікага Совецкага Саюза. Але ніколі нікому не ўдасца адабраць у нас нашы заваяванні, нікому не ўдасца адарваць нашу рэспубліку ад вялікай дружнай сям'і рэспублік магутнага Совецкага Саюза.

Наша рэспубліка ёсць і будзе несакрушымым фарпостам Совецкага Саюза на яго заходняй граніцы. І калі фашысцкія драпежнікі пасмеюць пасягнуць на нашу свяшчэнную зямлю, беларускі народ разам з усімі народамі краіны Советаў грудзьмі стане на абарону соцыялістычных заваяванняў і знішчыць ворага на яго ўласнай тэрыторыі.

Няхай жыве магутны совецкі народ!

Няхай жыве Усесаюзная Комуністычная партыя (большэвікоў) на чале з яе баявым штабам — Ленінска-Сталінскім ЦК!

Няхай жыве соцыялістычны парламент першай у свеце краіны соцыялізма—Вярхоўны Совет СССР і яго слаўны кіраўнік Міхаіл Іванавіч **Калінін!**

Няхай жыве натхніцель нашых перамог, мудры правадыр працоўных, вялікі, родны і любімы таварыш **Сталін!**

МАСКВА, КРЭМЛЬ

НАРОДНАМУ КАМІСАРУ АБАРОНЫ САЮЗА ССР МАРШАЛУ СОВЕЦКАГА САЮЗА — таварышу ВАРАШЫЛАВУ

Вернаму баявому саратніку вялікага Сталіна, слаўнаму правадыру герaічнай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі — Кліменту Ефрэмавічу Варашылаву ў дзень 20-ай гадавіны ўтварэння Совецкай Беларусі працоўныя сталіцы ордэнаноснай БССР ад імя ўсяго беларускага народа шлюць вам палкае большэвіцкае прывітанне.

Дарагі Клімент Ефрэмавіч!

У гэты знамянальны дзень, падагульваючы вынікі велізарных гістарычных перамог соцыялізма ў нашай краіне, мы хочам падзяліцца з Вамі, нашым дэпутатам у Вярхоўны Совет СССР, пачуццём велізарнай радасці і шчасця, якім поўны сэрцы беларускага народа.

Перамога Кастрычніцкай рэволюцыі, ажыццяўленне ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, брацкая дапамога герaічнага рускага народа і пастаянныя клопаты вялікага Сталіна ператварылі Беларусь з калоніі рускага царызма, краіны бяспраўя, эксплаатацыі, жабрацтва і голаду ў квітнеючую свабодную соцыялістычную рэспубліку.

Беларускі народ пад мудрым кіраўніцтвам партыі Леніна — Сталіна, у дружнай сям'і народаў Совецкага Саюза ўзняў на небывалую вышыню сваю соцыялістычную гаспадарку, культуру і быт і ўпэўнена ідзе да новых перамог.

Як-бы ні шалелі ворагі чалавецтва—фашысты і іх подлыя трацкісцка-бухарынскія і нацыянал - фашысцкія найміты, ім ніколі не ўдасца парушыць сталінскае адзінства многанацыянальнага совецкага народа і затрымаць яго пераможнае шэсце да вяршынь комунізма.

Мільёны працоўных БССР поўны бязлітаснага гневу да ворагаў народа—найміттаў японa-нямецкага і польскага фашызма.

Беларускі народ пад кіраўніцтвам партыі Леніна — Сталіна выкрываў, бязлітасна знішчаў і будзе знішчаць усякага, хто паспрабуе парушыць свабоду і цесную дружбу народаў вялікага многанацыянальнага Совецкага Саюза.

Няхай ведаюць імперыялістычныя драпежнікі, што і на заходніх граніцах краіны соцыялізма яны сустрэнуць сакрушальны адпор і знойдуць сабе ганебную гібель.

Памятаючы ўказанні таварыша Сталіна аб капіталістычным акружэнні, мы павышаем большэвіцкую пільнасць, ператвараем кожнае прадпрыемства і калгас у непрыступную крэпасць соцыялізма і гатовы ў любую мінуту біць ворага на той тэрыторыі, адкуль ён з'явіцца.

Мы запэўняем нашу партыю, совецкі ўрад, вялікага Сталіна і Вас, дарагі Клімент Ефрэмавіч, што, калі ашалеўшы вораг рызыкне навязаць вайну Совецкаму Саюзу, — увесь беларускі народ разам з слаўнай непераможнай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміяй, рынецца грознай лавінай на ворага.

Няхай жыве наш свабодны, шчаслівы совецкі народ!

Няхай жыве наша герaічная непераможная Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія!

Няхай жыве першы маршал Совецкага Саюза, верны саратнік вялікага Сталіна, любімы нарком абароны, наш дэпутат у Вярхоўны Совет Саюза ССР Клім **Варашылаў!**

Няхай жыве наш бацька, друг, настаўнік і правадыр — Іосіф Вісарыёнавіч **Сталін!**

Мікола АЎРАМЧЫК

Беларусі

Я амаль-што равеснік табе па гадах
(За мяне ты старэй адным годам).
Я тады нарадзіўся, як ты у баях
Адбівала правы на свабоду.
Я равеснік не той Беларусі старой,
Што цярпела пакуты, мучэнні...
А табе, маладой і бадзёрай, якой
Дваццаць год ад свайго нараджэння.
Ну, скажыце, хіба-ж не на гэтай зямлі
За жыццё беларускага краю
Украінец і рускі кроў пралілі
У змаганні з варожаю зграяй?..
Праляцелі гады. Многа з рэчак вады
Адплыло у далёкія моры...
Я ўзрастаў і дужэў між сяброў маладых,
Аніколі не знаючы гора.
Мне з маленства знаёма усё навакол.
За пражытыя леты і зімы.
Я узрос, узмужнеў, я ўжо стаў юнаком,
Дужым сынам Вялікай Радзімы.

Ты расла, Беларусь, паміж родных сясцёр
Роўнапраўнай шчаслівай сястрою.
Абагрэтая ласкай рубінавых зор,
Што гараць над Крэмлёўскай сцяною.
Ці гляджу, Беларусь, на твае гарады,
Ці гляджу на калгасныя нівы, —
Так і хочу сказаць: «Дарагі правадыр,
Паглядзі ты, які я шчаслівы!»
На багатых, прасторных калгасных палях
Шалясціць ураджаем калоссе...
Я шчаслівы бясконца, Радзіма мая,
Што мне жыць вось цяпер давялося.
І не толькі, што жыць, — таго мала, каб жыць
Сведкай дзён гэтых радасных, новых,—
Рад я тым, што даводзіцца цэглу лажыць
На вялікіх тваіх пабудовах.

ДВАЦЦАЦЬ ГОД БЕЛАРУСКАЙ ССР

Утварэнне БССР, як роўнаправўнай, суверэннай совецкай дзяржавы, стала магчымым толькі дзякуючы Вялікай соцыялістычнай рэвалюцыі 1917 года, скінуўшай уладу капіталістаў і памешчыкаў у Расіі, знішчыўшай нацыянальны гнёт і няроўнасць, ператварыўшай былую турму народаў у магутны саюз працоўных усіх нацыянальнасцей. Без звяржэння царызма, без разгрому ўлады імперыялістычнай буржуазіі, без узброенай дапамогі рускага пралетарыята — Беларусь ніколі-б не вышла з становішча поўкаланіяльнай акраіны Рускай імперыі, ніколі не адстаяла-б сваёй самастойнасці ад насядаўшых на яе з захаду імперыялістычных суседзяў.

Да Кастрычніцкай рэвалюцыі Беларусь уяўляла забітую, цёмную акраіну з адсталай сельскагаспадарчай тэхнікай і мізэрнымі ўраджаямі, з велізарнымі памешчыцкімі маёнткамі, з дробнай, галоўным чынам саматужнай, прамысловасцю і нізкай заработнай платай, акраіну найбольш жорсткага нацыянальнага гнёту, бяспраўя працоўных і дзікага свавольства памешчыцка-паліцэйскага рэжыма.

Да рэвалюцыі 664.000 сялянскіх двароў беларусаў мелі 33,5 проц. зямлі, а 4.000 рускіх, беларускіх і польскіх памешчыкаў мелі 66,5 проц. зямлі. Толькі пяць польскіх магнатаў — князь Вітгенштэйн, граф Тышкевіч, граф Патоцкі, князь Радзівіл, княгіня Гогенлоэ валодалі больш чым двума мільёнамі дзесяцін беларускай зямлі. Памешчыкі мелі лепшую зямлю, а працоўныя — балотныя, тошчыя неўраджайныя землі, пяскі, падзол.

Апрацоўвалася зямля двурогай драўлянай сахой і бараной з перавязаных лыкам яловых суччаў. Плуг і барана з жалезнымі зуб'ямі былі рэдкасцю.

Зямля не магла забяспечыць сям'ю беларускага селяніна хлебам на круглы год, а непасільныя падаткі і павіннасці разаралі яго канчаткова.

Беднасць беларускай вёскі была патрасаючай. У беларускіх вёсках бульбу варылі па некалькі разоў у адной вадзе, каб з'эканоміць соль. Нават запалку для эканоміі раскалвалі на дзве і тры часткі.

Вясной, калі ўжо хлеба не было, цэлыя вёскі харчаваліся мякінай, варылі мох, кару і т. д. З таго часу яшчэ сям-там захаваліся назвы вёсак: Махаеды, Караеды, Балацянкі, Саламянкі і т. д.

Лютавалі хваробы — каўтун і трахома; іх не было каму лячыць. Смяротнасць была выключна высокай.

Выдатны рускі паэт Некрасаў так апісаў тружаніка-беларуса таго часу:

«... Волосом рус,
Видишь, стоит, изможден лихорадкою,
Высокорослый, больной белорусс.
Губы бескровные, веки опавшие,
Язвы на тощих руках,
Вечно в воде по колено стоявшие
Ноги опухли, колтун в волосах.
Ямою грудь, что на заступ
старательно
Изо дня в день налегала весь век.
Ты приглядись к нему, Ваня,
внимательно,
Трудно свой хлеб добывал человек».

Нястача хлеба, прага да лепшай долі гналі беларускага працоўнага з роднай вёскі ў горад, у глухую, у тыя годы, Сібір, на Далёкі Усход, у далёкую Амерыку. Разараючыся, велізарная маса беларускага сялянства ішла ў гарады, памнажаючы армію беспрацоўных і зніжаючы гэтым і без таго жабрацкі жыццёвы ўзровень працуючых.

Не лепш жыў і беларускі рабочы. Сярэдняя гадавая заработная плата беларускага рабочага складала 179 руб.

Старая работніца, цяпер стаханаўка Ільнапрадзільнай фабрыкі ім. Кагановіча ў г. Віцебску, Матрона Якаўлеўна Міхайлава расказвае:

«На бельгійскай акцыянернай фабрыцы «Дзвіна» ў горадзе Віцебску я гнула спіну 12 год. Ватэрны цэх, на якім я працавала, быў, усё роўна, як памыйная яма: былі сырасць і бруд, ніякай вентыляцыі не было. Працуючы 11 год, я, як кваліфікаваная работніца, усё-ж атрымоўвала ад 30 да 40 кап. у дзень. Пераважная частка гэтага заработку ішла на штрафы, штрафавалі нас за ўсё, асталіся адны грашы і жыць прыходзілася ўпрогаладзь».

У 1913 годзе на душу насельніцтва ў Беларусі прыходзілася нават параўнальна з Расіяй у 3,5 раз менш прамысловай прадукцыі і ў 15 разоў менш электраэнергіі.

Аб эканоміцы дарэвалюцыйнага Магілева ў старой энцыклапедыі гаварылася: «Гандаль скурай, салам, мёдам, воскам». А губернатар у 1912 годзе даносіў па начальству: «З асобных вытворчасцей найбольшае значэнне ў губерні, як і раней, прадастаўляецца вытворчасці вінакуранай».

На самым буйным прадпрыемстве ў Беларусі працавала 200 рабочых і служачых.

Беларусы не мелі права на беларускую культуру, не мелі права абучэння на роднай мове. Указам міністэрства народнай асветы нават было забаронена гаварыць аб тым, што ёсць беларуская мова. Беларуская мова разглядалася як жаргон. Беларусь да Кастрычніка была мяжой яўрэйскай аседласці, краінай яўрэйскага гето, брудных, утапаючых у страшэнным жабрацтве яўрэйскіх мястэчак, у якіх царскі чыноўнік, жандар і рабін высіскалі з яўрэйскай беднаты пот і кроў.

Пагроза яўрэйскіх пагромаў бесперапынным жахлівым кашмарам вісела над галавою ні ў чым невінаватых людзей.

Мінск — былы цэнтр «мяжы яўрэйскай аседласці» — тапіўся ў брудзе і безкультур'і. Народ трымаўся ў цемнаце і невуцтве. 75 працантаў насельніцтва было непісьменным.

У Беларусі не было ні адной вышэйшай навучальнай установы, ні аднаго беларускага тэатра, затое мелася 5 тысяч манаполек, 3 тысячы цэркваў, 113 касцёлаў, 704 сінагогі.

Не гледзячы на вельмі жорсткую каланіяльную палітыку царызма, які прабаваў у саюзе з польскай шляхтай задушыць свабодалюбны дух беларускага народа і вытравіць яго нацыянальнае самасазнанне, беларускі народ здолеў пранесці скрозь вякі сваю культуру, сваю мову, сваю волю да перамогі.

Польскае шляхецтва ведала адносіны да сябе беларускага народа. Сучаснікі з шляхты прама пісалі, што «войскі польскай шляхты, якія прыходзілі ў Беларусь, адчувалі сябе заўсёды ў варожым акружэнні».

Другі сучаснік даносіў польскаму каралю, што «гарады беларускія пагражаюць яўным абурэннем, а мужыкі моляць бога, каб прышла Масква».

Беларускі народ, задаўлены непасільнай эксплаатацыяй, паўставаў супроць усіх прыгнятальнікаў — рускіх і беларускіх памешчыкаў, польскіх паноў, шляхціч аў. Ён знішчаў чыноўнікаў польскага караля, тапіў у балотах прагных ксяндзоў, паліў панскія маёнткі.

У народнай памяці захаваліся справы і імёны кіраўнікоў сялянскіх паўстанняў — Налівайкі, Ільі Галоты, Міхаіла Глінскага, Небабы, Крывашапкі, Гаркушы, Міхаенкі, Восчылы, Хрыська Каліноўскага і інш.

Усе гэтыя паўстанні былі затоплены ў крыві. Працоўнае сялянства магло вызваліцца ад феадальнага і капіталістычнага гнёту толькі ў саюзе і пад кіраўніцтвам рабочага класа. Толькі партыя рабочага класа, асвятляючая шлях барацьбы перадавой рэвалюцыйнай тэорыяй, магла забяспечыць перамогу працоўных у баях за сваё вызваленне.

***

Вялікія правадыры чалавецтва Ленін і Сталін указалі прыгнечаным народам шлях да вызвалення.

Яшчэ ў 1894 годзе Ленін у сваёй рабоце «Што такое «прыяцелі народа» і як яны ваююць супроць соцыялдэмакратаў» пісаў:

«Няма іншага сродку барацьбы з нацыянальнай нянавісцю, як арганізацыя і згуртаванне класа прыгнечаных для барацьбы супроць класа прыгнятальнікаў, у кожнай асобнай краіне, як злучэнне такіх нацыянальных рабочых арганізацый у адну міжнародную рабочую армію для барацьбы супроць міжнароднага капітала».

У сваёй рабоце «Марксізм і нацыянальнае пытанне», напісанай у 1913 г., таварыш Сталін выкрыў контррэвалюцыйныя нацыяналісцкія спробы меншавікоў, трацкістаў, бундаўцаў сарваць справу інтэрнацыянальнага аб'яднання працоўных і вызначыў змест права нацый на самавызначэнне.

«Нацыя мае права,—пісаў таварыш Сталін, — свабодна вызначыць свой лёс; яна мае права ўстроіцца так, як ёй угодна, не паціраючы, зразумела, праў іншых нацый. Гэта бясспрэчна...

Яна мае права наладзіць сваё жыццё на пачатках аўтаноміі. Яна мае права ўступіць з іншымі нацыямі ў федэратыўныя адносіны. Яна мае права зусім аддзяліцца. Нацыя суверэнна, і ўсе нацыі роўнаправўны».

Гэтыя работы з'явіліся магутнай ідэалагічнай зброяй большэвікоў у барацьбе з шавінізмам усіх масцей, пачынаючы ад рускіх чорнасоценцаў і канчаючы яўрэйскімі, беларускімі і іншымі нацыяналістамі.

Работы таварыша Сталіна па нацыянальнаму пытанню, і ў асаблівасці ідэя аб праве нацыі на самавызначэнне, выбілі глебу з-пад ног контррэвалюцыйных нацыяналістычных партый, якія пад відам «абароны бацькаўшчыны», інтарэсаў «свайго народа» абаранялі буржуазную дзяржаву і інтарэсы сваёй нацыянальнай буржуазіі.

Рэвалюцыйны рабочы рух Беларусі на працягу ўсёй сваёй гісторыі развіваўся ў цесным яднанні з рабочым рухам усёй Расіі, як частка гэтага руху. Буржуазным беларускім нацыяналістам і бундаўцам не ўдалося пасеяць рознь і адарваць рабочы клас Беларусі ад гераічнага рускага рабочага класа. Рука аб руку з ім рабочы клас Беларусі, пад кіраўніцтвам вялікай большэвіцкай партыі, прывёў беларускі народ да Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі.

У рэзультаце рэвалюцыйнай барацьбы рабочых і салдат, кіруемых большэвікамі, у першых чыслах лістапада ў Менску ўстанавілася Совецкая ўлада.

10 лютага 1918 года Троцкі ў Брэсце арабіў страшэнную здраду: парушыўшы дырэктыву ЦК і тав. Леніна, адмовіўся падпісаць мір з Германіяй. Рэзультатам гэтай здрады з'явілася наступленне германскіх войск і акупацыя Беларусі.

Германская акупацыя Беларусі — гэта крывавая старонка ў гісторыі беларускага народа. Гэта была оргія грабяжоў, свавольстваў, жорсткіх насілляў, катаванняў, расстрэлаў.

Беларускія контррэвалюцыйныя нацыяналісты, якія прыкрываліся фальшывым нацыянальным сцягам, падтрымлівалі ў свой час урад Керэнскага, цалавалі боты германскага кайзера, кланяліся аўстра-венгерскаму імператару, заігрывалі з Англіяй і Францыяй, прапаноўвалі свае паслугі Амерыцы, шукалі, каму-б выгадней прадаць Беларусь, у перыяд акупацыі вылезлі з падполля, уступілі ў блок з Бундам, Поалей-Цыонам, з групай памешчыкаў і фабрыкантаў, абвясцілі ў Менску так званую «Беларускую народную рэспубліку» пад апекай акупантаў і паслалі нямецкаму кайзеру тэлеграму з выказваннем «найглыбейшай удзячнасці за вызваленне Беларусі германскімі войскамі».

П. К. ПАНАМАРЭНКА

Сакратар ЦК КП(б) Беларусі

***

Аднак, ход гісторыі ніхто не змог спыніць. Нямецкія інтэрвенты пад ударамі Чырвонай Арміі з фронта, беларускіх партызан з тылу, пры поўным разлажэнні сваіх часцей, не хацеўшых ваяваць з Совецкай Расіяй, восенню 1918 года ўцяклі з Беларусі.



10 снежня 1918 года Чырвоная Армія ўступіла ў Менск.

Перад вызваленай Беларуссю ўсталі неадкладныя задачы дзяржаўнага будаўніцтва і замацавання заваяванняў соцыялістычнай рэвалюцыі.

Скліканая 30 снежня 1918 года VI Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РКП(б), па прапанове таварыша Сталіна, абвясціла сябе Першым з'ездам комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі.

Канферэнцыя пастанавіла:

«Прымаючы пад увагу, што на чарговай VI Паўночна-Заходняй абласной канферэнцыі РКП(б) прадстаўлены поўнасцю ўсе знаходзячыяся на тэрыторыі Беларусі комуністычныя арганізацыі, канферэнцыя абвяшчае сябе 1-м з'ездам компартыі (большэвікоў) Беларускай рэспублікі».

Гістарычныя рашэнні канферэнцыі, якія вызначылі стварэнне беларускай дзяржаўнасці, былі распрацаваны і ажыццёўлены пад непасрэдным кіраўніцтвам вялікага друга беларускага народа І. В. Сталіна, у непрымірымай барацьбе з буржуазнымі беларускімі нацыяналістамі, трацкістамі, меншавікамі і іншымі здраднікамі.

Вечарам 1 студзеня 1919 года быў апублікаван гістарычны маніфест Часовага рэвалюцыйнага рабоча-сялянскага совецкага ўрада Беларусі, які з'явіўся першым канстытуцыйным актам, юрыдычна аформіўшым асновы грамадскага і дзяржаўнага ладу маладой Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.

Велізарная работа, праведзеная большэвіцкай партыяй у шырокіх масах беларускага народа, рашучае выкрыццё контррэвалюцыйных дзеянняў беларускіх нацдэмаў, бундаўцаў, трацкістаў і іншай мразі забяспечылі магчымасць склікаць у пачатку лютага 1919 года першы з'езд Советаў Беларусі, на якім была прынята першая Канстытуцыя БССР, палітычнай асновай якой паслужыла гістарычная першая Канстытуцыя брацкай РСФСР, распрацаваная таварышамі Леніным і Сталіным і зацверджаная 10 ліпеня 1918 года V Усерасійскім З'ездам Советаў. Канстытуцыя абвяшчала Беларусь Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікай, у якой уся ўлада ў цэнтры і на месцах належыць рабочаму насельніцтву краіны, аб'яднанаму ў гарадскія і сельскія советы.

Рашэнні гістарычнага першага з'езда Советаў Беларусі выцякалі з няўхільнага імкнення беларускага народа да ўстанаўлення цеснага саюза з РСФСР і ўсімі ўзнікшымі ў рэзультаце Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі совецкімі рэспублікамі. Гэтыя імкненні выразіліся ў дэкларацыі з'езда, прынятай 3 лютага 1919 года, у якой было запісана: «Пачаць перагаворы з Расійскай Совецкай Рэспублікай па ўстанаўленню федэратыўнай сувязі паміж ёю і Совецкай Беларуссю». З'езд заклікаў усе астатнія совецкія рэспублікі ўзяць прыклад з рабочых і сялян Беларусі—прыступіць да перагавораў аб устанаўленні федэратыўнай сувязі паміж Совецкай Расіяй і паміж сабою.

У работах першага з'езда Советаў Беларусі прымаў удзел бліжэйшы саратнік таварышаў Леніна і Сталіна, першы старшыня Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта — таварыш Я. М. Свердлоў.

Гэта дэкларацыя — найярчэйшая ілюстрацыя вялікай мудрасці ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі. Рабочыя і сяляне былой царскай калоніі прызналі неабходнасць стварэння добраахвотнага брацкага садружаства працоўных совецкіх рэспублік. Такі быў вынік першага перыяду будаўніцтва Совецкай улады.

Совецкай Беларусі прышлося перажыць пасля гэтага яшчэ адзінаццаць месяцаў польскай акупацыі. Гэта былі месяцы помсты «яснавяльможнага» панства беларускаму рабочаму і селяніну за соцыялістычную рэвалюцыю. Памешчыкі вярнулі свае маёнткі, адабралі зямлю; розгі і шампалы, расстрэлы і шыбеніцы сталі звычайнай з'явай. Карныя экспедыцыі навадпілі краіну. Вярнуўшыяся ўласнікі зволілі ўсіх рабочых-актывістаў. Усе чыгуначнікі былі зволены і на іх месцы былі прысланы «надзейныя людзі» знутры Польшчы. Усе беларускія школы былі закрыты.

У гэтыя цяжкія дні беларускаму народу зноў аказалі падтрыманне і дапамогу брацкі рускі народ, комуністычная партыя большэвікоў і таварыш Сталін.

Пад непасрэдным кіраўніцтвам таварыша Сталіна і таварыша Серго Орджанікідзе, стаяўшых на чале Заходняга фронта, польскія інтэрвенты былі разгромлены і выгнаны з Беларусі назаўсёды.

З гордасцю беларускі народ успамінае словы таварыша Сталіна аб сустрэчы Чырвонай Арміі з працоўнымі Беларусі:

«Такіх адносін, — гаварыў ён, — мне не прыходзілася сустракаць ні на ўсходзе, ні на поўдні. Не гледзячы на беднасць сялянскіх мас на Захадзе ў параўнанні з Паволжжам і Поўднем, усё-ж сяляне дзяліліся апошнім з чырвонаармейцамі. Насельніцтва прыфрантавой паласы перанесла ўвесь цяжар польскай акупацыі, таму вельмі добра ўсведамляла, чым пагражае яму ўтаржэнне польскіх паноў.

На нашым фронце ёсць цэлая група войск, уся санітарная справа якой знаходзіцца ў руках сялян і сялянак, праяўляючых найвялікшыя клопаты і ўвагу да нашых раненых чырвонаармейцаў...

Што датычыць настрою беларускіх сялян за франтавой паласой, то, па нашых вестках, там адбываюцца суцэльныя паўстанні, працуюць партызанскія атрады, якія разбураюць тыл праціўніка, спальваючы склады і знішчаючы памешчыкаў...»

Геніяльныя стратэгі пралетарскай рэвалюцыі Ленін і Сталін стварылі комуністычную партыю большэвікоў Беларусі. Яны кіравалі ўсёй барацьбой беларускага народа па стварэнню Совецкай улады, яны арганізавалі разгром нямецкіх і белапольскіх інтэрвентаў. Пад асабістым і непасрэдным кіраўніцтвам таварыша Сталіна, Беларуская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка ператварылася ў квітнеючую ордэнаносную рэспубліку, верны фарпост Совецкага Саюза на заходніх граніцах.

З велізарнай любоўю беларускі народ успамінае рэвалюцыйную работу ў Беларусі верных саратнікаў Леніна і Сталіна, таварышаў Л. М. Кагановіча, М. В. Фрунзе, М. І. Калініна, Серго Орджанікідзе, Я. М. Свердлова.

У годы мірнага будаўніцтва і перамогі сталінскіх пяцігодак, як і ў годы грамадзянскай вайны, беларускі народ штодзённа і штогадзінна адчуваў дапамогу вялікага рускага народа, бацькоўскія клопаты лепшага друга беларускага народа—вялікага Сталіна.

***

Пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі расцвяла Совецкая Беларусь.

Соцыялістычная прамысловасць Беларусі зараз займае 73 проц. па ўдзельнай вазе ў народнай гаспадарцы; у 1937 годзе яна дала прадукцыі ў 23,6 разы больш чым у 1913 годзе.

У Беларусі ўноў створана машынабудаўнічая, хімічная, тэкстыльная, скураная, дрэваапрацоўчая прамысловасць і сельскагаспадарчае машынабудаўніцтва.

У Беларусі ў 1936—1937 гг. выпрацавана электраэнергіі ў 97 разоў больш чым у 1913 годзе.

Толькі на буйных прадпрыемствах і транспарце ў Беларусі працуе 200 тысяч рабочых супроць 13 тысяч у 1913 годзе.

Беларусь не ведае беспрацоўя.

Як і ва ўсім Саюзе, у рабочага-беларуса самы кароткі ў свеце 7-гадзінны рабочы дзень—вялікая заваёва Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Стаханаўцы Беларусі перакрываюць сусветныя рэкорды. Лік стаханаўцаў шырыцца.

Нязмерна вырас матэрыяльны ўзровень жыцця рабочых Беларусі. Рабочы нараўне з інжынерам, прафесарам, урачом, настаўнікам наведвае тэатры, кіно, музеі, лекцыі, набывае прыгожы абутак, адзенне, мэблю.

Канчаткова ўмацаваўся калгасны лад. У Беларусі ёсць 9.665 калгасаў, якія аб'ядноўваюць 720 тысяч сялянскіх двароў. Калгаснае сялянства Беларусі атрымала 8 мільёнаў гектараў зямлі, замацаванай за калгасамі на вечнае карыстанне.

Калгасы БССР у 1938 годзе засявалі 94 проц. усёй пасеўнай плошчы. За годы Совецкай улады пасеўная плошча Беларусі павялічылася ў паўтара раза. Пасевы тэхнічных культур павялічыліся ў тры разы, пасевы бульбы— у 2 разы.

У Беларусі ёсць 227 машынна-трактарных станцый, 8.141 трактар, звыш тысячы камбайнаў, звыш 4 тысяч аўтамашын, 2.680 трактарных сеялак, дзесяткі тысяч складаных, поўскладаных малацілак, ільнацерабілак, жнеярак і іншых сельскагаспадарчых машын.

З года ў год расце ўраджайнасць соцыялістычных палёў. Сотні калгасаў атрымалі ў гэтым годзе ўраджай па 15—20 цэнтнераў зерневых, 5—8 цэнтнераў ільну, 150—200 цэнтнераў бульбы.

У рэспубліцы ў два разы павялічылася колькасць буйнай рагатай жывёлы, свіней і авечак супроць 1916 года.

У калгасах Беларусі ёсць 6.992 фермы буйнай рагатай жывёлы, 4.545 аўцагадоўчых ферм, 4.724 свінагадоўчыя фермы, 335 конеферм.

Адна трэць сялянскіх двароў да рэвалюцыі была бескароўнай, зараз бескароўнасць ліквідавана поўнасцю.

Да 1913 года на тэрыторыі цяперашняй БССР было каля 20 тысяч гектараў садоў, якімі валодалі памешчыкі, царкоўнікі і кулакі. У калгасах Беларусі ёсць 63 тысячы гектараў садоў.

Калгаснікі і калгасніцы Беларусі дасканала авалодваюць навукай і тэхнікай соцыялістычнай сельскай гаспадаркі. За годы Совецкай улады выхаваны выдатныя кадры сельскай інтэлігенцыі. Калгасны лад стварыў новыя прафесіі, якіх не было і не магло быць у дарэвалюцыйнай Беларусі.

У Беларусі ёсць звыш тысячы аграномаў, 600 заатэхнікаў, 200 ветурачоў, 23 тысячы трактарыстаў, 2 тысячы машыністаў малацілак, 1.400 трактарных механікаў, 2.000 камбайнераў, 13.000 палеводаў і т. д.

З года ў год становіцца ўсё больш заможным, культурным і радасным жыццё калгаснікаў. Многія калгасы выдаюць на працадзень у гэтым годзе 3—4 кілограмы хлеба, 8—10 кілограмаў бульбы, 3—4 рублі грашыма, кармы для жывёлы, гародніну і іншыя прадукты.

Новыя песні спявае калгаснае сялянства Беларусі:

Мы заможнымі сталі з калгаснага ладу;
Масла, сыр, каўбаса і віно сваё ёсць.
Усяго на стале, і мы шчыра так рады,
Калі хату з дарогі наведае госць.
У часы адпачынку ў запале
нястрымным
Маладосць весяліцца, аж хата звініць.
Ад душы табе скажам, наш Сталін
любімы,
Як добра, як весела сёння нам жыць.

У гэтых песнях калгаснае сялянства славіць сваю магутную комуністычную партыю, славіць творца Совецкай Канстытуцыі, бацьку і друга беларускага народа — любімага Сталіна; у гэтых песнях гучыць словы перамог, заваяваных беларускім народам за 20 год пад кіраўніцтвам вялікай партыі Леніна — Сталіна.

У БССР у асноўным ліквідавана непісьменнасць. 1.256 тысяч совецкіх рэбят, юнакоў і дзяўчат навучаюцца ў 7.071 школе, 22 ВНУ, 80 педвучылішчах і тэхнікумах і 20 рабфаках рэспублікі.

Вырасла інтэлігенцыя БССР — соль зямлі совецкай. Толькі за апошнія годы з вышэйшых навучальных устаноў БССР вышла 9.806 спецыялістаў: інжынераў, урачоў, юрыстаў, педагогаў.

Совецкая Беларусь мае Акадэмію навук і 1.263 навуковых работнікаў.

Беларусь мае народных паэтаў рэспублікі Янку Купалу і Якуба Коласа. Побач з старэйшым пакаленнем мастакоў слова, прадстаўленых такімі імёнамі, як З. Бядуля, М. Лынькоў, К. Крапіва, узнялася і расце цэлая плеяда маладых, таленавітых пісьменнікаў, як П. Броўка, П. Глебка, Ів. Шапавалаў, А. Куляшоў, Э. Самуйлёнак, Э. Агняцвет і інш.

БССР мае 14 драматычных тэатраў, Тэатр оперы і балета, Філармонію, Кансерваторыю.

Выраслі такія мастакі сцэны, як заслужаная артыстка рэспублікі тав. Александроўская, заслужаны артыст рэспублікі тав. Уладамірскі, артысты тт. Балоцін, Дзянісаў, Аляксеева, Млодэк; артысты драмы тт. Малчанаў, Звездачотаў, Ільінскі, Сокал, Арончык; рэжысёры тт. Зораў, Рахленка, дырыжор т. Шнейдэрман і інш.

Беларускія кампазітары, дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Туранкоў, тав. Багатыроў; тт. Любан, Цікоцкі, Шчэглоў плённа працуюць над стварэннем новых музыкальных твораў. Тав. Цікоцкім напісана беларуская опера «Міхась Падгорны». Тав. Багатыровым напісана беларуская опера «Дрыгва», прынятая да пастаноўкі не толькі ў БССР, але і ў тэатрах брацкіх нацыянальных рэспублік. Тав. Туранкоў працуе над стварэннем оперы аб пагранічніках.

Беларуская кіностудыя дала совецкаму гледачу такія карціны, як «Шукальнікі шчасця», «Канцэрт Бетховена», «Балтыйцы», «Дачка радзімы», «Мядзведзь», «11 ліпеня».

Беларускія мастакі і скульптары тт. В. Волкаў, Зайцаў, Пашкевіч, Керзін, Грубэ стварылі рад каштоўных твораў беларускага мастацтва.

***

Гэтыя поспехі былі-б значна большымі, калі-б не подлая работа праз рэнных ворагаў народа, трацкістаў, бухарынцаў, нацыяналістаў — агентаў германа-польскага фашызма, здраднікаў і прадажнікаў беларускага народа, якія ў свой час змаглі прабрацца нават у кіруючыя партыйныя і совецкія органы Беларусі.

Гэтыя праз рэнныя ворагі шкодзілі ўсюды, дзе толькі маглі. Яны хацелі аслабіць Беларусь — фарпост краіны соцыялізма на Захадзе. Яны працавалі на адрыў яе ад СССР. Яны хацелі зноў вярнуць ёй праклятае мінулае, ператварыць яе ў калонію фашысцкіх краін. Галоўныя іх намаганні былі накіраваны на тое, каб паслабіць калгасы. Яны насаджалі хутары, яны заблытвалі севазвароты, засмечвалі насенне, заражалі жывёлу інфекцыйнымі хваробамі. Яны адбіралі ў калгаснікаў прысядзібныя ўчасткі. Яны пазбаўлялі жывёлу калгаснікаў пасьбішчаў. Яны пазбаўлялі калгаснікаў карыстання лясамі мясцовага значэння. Яны расстаўлялі сваю агентуру ў калгасах для таго, каб разлажыць калгасы знутры. Яны заахвочвалі парушэнні Статута сельскагаспадарчай арцелі. Яны не выкарыстоўвалі поўнасцю велізарныя сумы, якія адпускаліся саюзным урадам для ўкладання ў народную гаспадарку БССР. Ворагі імкнуліся гэтым паслабіць абаронную магутнасць, затрымаць развіццё Беларускай рэспублікі.

Іх контррэвалюцыйная нацыяналістычная агентура, працаваўшая ў галіне мовы, літаратуры і мастацтва, правяла там сваю подлую, шкодніцкую работу. Яны скажалі правапіс у нацыяналістычным духу, ячы засмечвалі мову чуждымі, антынароднымі словамі. Яны нават прабавалі перавесці беларускую мову на лацінскую аснову. Яны хацелі стварыць такую мову, праз якую было-б лягчэй праводзіць сваю работу і праз якую яны маглі-б прабаваць цягнуць масы на Захад. Яны прабавалі вытравіць з літаратуры ўсё, што напамінала аб сумеснай барацьбе рускага і беларускага народа за вызваленне, скажалі гісторыю. Яны прабавалі дабіцца, каб з беларускай літаратуры выпала фігура польскага пана, як спрадвечнага ворага беларускага народа.

Яны пралічыліся. Беларускі народ, пад кіраўніцтвам партыі Леніна — Сталіна, пры дапамозе органаў НКВД, разграміў і знішчыў асіныя гнёзды фашысцкіх наймітаў.

***

Наша партыя і ўвесь совецкі народ узбагаціліся геніяльным сталінскім тварэннем — «Кароткім курсам гісторыі ВКП(б)».

Толькі Сталінскі ЦК ВКП(б), які ўвабраў у сабе ўсю мудрасць сякоў, увесь вопыт большэвіцкай партыі, увесь вопыт дыктатуры рабочага класа, мог стварыць навуковую працу, у якой глыбока паказана слаўная гісторыя гераічнай барацьбы і перамог партыі Леніна — Сталіна.

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі — верны, непахісны атрад вялікай партыі Леніна — Сталіна, — загартаваная ў баях з ворагамі, узбройваючы свае атрады і кадры совецкай інтэлігенцыі веданнем тэорыі марксізма-ленінізма, павядзе беларускі народ да новых перамог па шляху да комунізма.

Ліквідуючы вынікі варожай работы, бесперапынна павышаючы палітычную пільнасць, выкараняючы астаткі варожай агентуры, беларускі народ у цесным супрацоўніцтве з брацкімі рускім, украінскім і іншымі народамі і далей будзе мацаваць абароназдольнасць рэспублікі, умацоўваць пагранічныя рубяжы.

Беларуская ордэнаносная Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка ў трэцяй пяцігодцы даб'ецца рашаючых поспехаў у справе яшчэ большага ўздыму матэрыяльна-культурнага становішча працоўных мас, павысіўшы ўраджайнасць калгасных палёў і ўзровень аплаты калгаснага працадня к канцу трэцяй пяцігодкі не менш чым у два разы.

Сіла і несакрушымасць Беларускай ССР, як фарпоста краіны соцыялізма на Захадзе, заключаецца ў вялікім патрыятызме беларускага народа, пазнаўшага праўду большэвікоў, у яго бязмежнай любві і адданасці партыі Леніна — Сталіна. Гэту сілу, гэту магутнасць адчуе на сабе ўсякі, хто адважыцца пераступіць свяшчэнныя рубяжы нашай радзімы.

20 год стварэння Беларускай ССР

УРАЧЫСТАЕ ПАСЯДЖЭННЕ У БЕЛАРУСКІМ ДЗЯРЖАЎНЫМ ТЭАТРЫ ОПЕРЫ І БАЛЕТА

1 студзеня, у 6 гадзін вечара, у Вялікім тэатры оперы і балета БССР адбылося ўрачыстае пасяджэнне партыйных, совецкіх, грамадскіх, комсамольскіх і профсаюзных арганізацый, прысвечанае 20-годдзю ўтварэння Беларускай ССР.

Па-святочнаму ўпрыгожаную залу запоўнілі 1.500 стаханаўцаў фабрык і заводаў, работнікі культуры, навукі, мастацтва, прадстаўнікі Чырвонай Арміі, дэлегацыі калгаснікаў.

Урачыстае пасяджэнне адкрывае сакратар Менскага абкома партыі тав. Матвееў.

Яго першыя словы, звернутыя да вялікага друга народаў, стваральніка беларускай дзяржаўнасці — таварыша Сталіна, тонуць у буры доўга незамаўкаючых авацый.

Пад бурную авацыю ў ганаровы прэзідыум выбіраюцца члены Палітбюро ЦК ВКП(б) на чале з таварышам Сталіным, а таксама таварышы Берыя, Дзімітраў, Тэльман і Хозе Дыяс.

Калі старшынствуючы называе імя таварыша Сталіна, уся зала ўстае і ў агульным парыве доўга і шумна апладыруе.

З дакладам «XX год БССР» выступіў старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР тав. Наталевіч.

Дакладчык абрысаваў шлях, пройдзены беларускім народам, разняволеным Вялікай Кастрычніцкай Социялістычнай рэволюцыяй. Беларускі народ пад кіраўніцтвам партыі Леніна — Сталіна, пры дапамозе народаў Совецкага Саюза, і ў першую чаргу вялікага рускага народа, змяніў твар сваёй рэспублікі, стварыў шчаслівае і радаснае жыццё. Тав. Наталевіч прыводзіць рад цікавых даных і лічбаў, характарызуючых каласальныя поспехі БССР за гэтыя 20 год у галіне прамысловасці, сельскай гаспадаркі, культуры, навукі, літаратуры і мастацтва.

Ад імя рабочых, калгаснікаў, совецкай інтэлігенцыі БССР сабраўшыхся горача вітаў стаханавец Менскага варштата-будаўнічага завода імя Кірава тав. Кісель.

У сваёй прамове ён сказаў:

— Пачуццём бязмежнай любві, беззаветнай адданасці і найвялікшай удзячнасці перапоўнены нашы сэрцы, удзячнасці і любві да таго, хто забяспечыў стварэнне, умацаванне і росквіт БССР, чыё імя з'яўляецца сімвалам нашых перамог, — да нашага правадыра, настаўніка, друга — роднага, любімага таварыша Сталіна. **(Бурныя апладысменты).**

Паглядзіце на нашу рэспубліку — якім шчаслівым і культурным жыццём жыве яна. Паглядзіце, як горда ўзнімаюцца ў вышыню шматлікія карпусы фабрык і заводаў, жылых дамоў, школ, клубаў, тэатраў, палацаў культуры.

Паглядзіце на нашы калгасныя палі, дзе ад ранняй вясны да позняй восені незамаўкае гул трактароў і камбайнаў.

У сваіх песнях беларускі народ славіць тварца Беларускай рэспублікі — мудрага і любімага таварыша Сталіна. **(Бурныя апладысменты, усе ўстаюць).**

Зала рукаплешча ўсхваляваным словам прамоўцы. Усе ўстаюць. З месц ляцяць воклічы: «Вялікаму Сталіну ура!», «Главе Совецкага ўрада таварышу Молатаву ура!»

У залу ўваходзіць дэлегацыя піонераў і школьнікаў Менска. У песнях і плясках народаў СССР школьнікі выяўляюць любоў шчаслівага юнага пакалення да таварыша Сталіна.

Адзін за другім выступаюць прадстаўнікі братніх рэспублік. У сваіх прывітальных словах на роднай мове дэлегаты з РСФСР, Украінскай ССР, Армянскай ССР, Узбекскай ССР, Казахскай ССР і іншых братніх рэспублік гавораць аб тым, што свята працоўных Беларусі — гэта свята ўсіх народаў вялікага шматнацыянальнага Совецкага Саюза, моцна спаяных сталінскай дружбай.

Выступленні прадстаўнікоў братніх рэспублік выліліся ў яркую дэманстрацыю ўрачыстасці ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі.

Гучаць фанфары. Чоткім крокам, пад разгорнутымі сцягамі ўваходзіць у залу дэлегацыя байцоў, камандзіраў і палітработнікаў Беларускай асобай ваеннай акругі і пагранічнікаў.

Прысутныя сустракаюць прадстаўнікоў слаўнай, непераможнай Чырвонай Арміі і пільных вартавых совецкіх рубяжоў натхнёнымі авацыямі.

З яркай прамовай выступіў старшы палітрук — пагранічнік войск НКВД БССР тав. Шапавалаў. Ен заверыў партыю, увесь совецкі народ, што доблесныя сыны совецкага народа, патрыёты социялістычнай радзімы—байцы Чырвонай Арміі і пагранічнікі пільна ахоўваюць недатыкальнасць граніц свяшчэннай совецкай зямлі.

З адказам на шматлікія прывітанні выступіў намеснік старшыні Соўнаркома БССР тав. Кулагін.

Ен заяўляе, што ўсімі сваімі грандыёзнымі поспехамі і дасягненнямі за дваццаць год беларускі народ абавязан комуністычнай партыі, правадыру працоўных усяго свету таварышу Сталіну і братняй дапамозе вялікага рускага народа. Пад кіраўніцтвам партыі працоўныя Беларусі разграмілі трацкісцка-бухарынскіх нацыянал-фашысцкіх шпіёнаў і правакатараў, спрабаваўшых закабаліць вызвалены беларускі народ.

— БССР, — закончыў сваю прамову тав Кулагін, — была, ёсць і будзе несакрушальным фарпостам вялікага СССР на яго заходніх рубяжах.

З вялікім уздымам удзельнікі ўрачыстага пасяджэння прынялі прывітальныя тэлеграмы ЦК ВКП(б), таварышам Сталіну, Молатаву, Варашылаву, Калініну.

Пасля ўрачыстага пасяджэння адбыўся вялікі канцэрт.

Прамова тав. Г. КАЗЛОВА

(Ад дэлегацыі РСФСР)

Па даручэнню Прэзідыума Вярхоўнага Совета РСФСР, ад імя народаў Расійскай Совецкай Федэрацыйнай Социялістычнай Рэспублікі перадаю братняе гарачае прывітанне і віншаванне гераічнаму беларускаму народу ў дзень 20-годдзя Беларускай Совецкай Социялістычнай Рэспублікі. **(Апладысменты).**

Дваццаць год таму назад рабочыя і сяляне Беларусі пры ўзброенай дапамозе рускага пролетарыята, пад кіраўніцтвам геніяльных правадыроў чалавецтва Леніна і Сталіна, назаўсёды скінулі нацыянальны гнёт расійскай імперыялістычнай буржуазіі і разграмілі беларускую нацыяналістычную контррэволюцыю.

Беларускі народ прайшоў 20-гадовы гераічны шлях і пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі і геніяльных правадыроў Леніна і Сталіна працоўныя Беларусі разам з доблеснай Чырвонай Арміяй ачысцілі сваю зямлю ад нямецкіх крывавых інтэрвентаў і польскіх паноў.

Працоўныя Беларусі з усёй бязлітаснасцю, як і ўсе працоўныя Совецкага Саюза, ачышчаюць сваю зямлю ад прэзрэнных трацкісцка-бухарынскіх, нацыяналістычных фашысцкіх шпіёнаў, здраднікаў радзімы.

Беларускі народ, як і ўсе народы нашых братніх рэспублік, бязмежна любіць сваю цудоўную радзіму, любіць слаўную партыю Леніна — Сталіна, бязмежна любіць вялікага правадыра, свайго роднага Сталіна.

Мы, прадстаўнікі братніх рэспублік, ад імя працоўных Совецкага Саюза на ўвесь голас заяўляем: гора будзе фашысцкім агрэсарам, калі яны паспрабуюць сваім крывавым ботам пераступіць свяшчэнныя граніцы нашай вялікай радзімы. Яны з удзесяцеранай сілай будуць разгромлены, як былі разгромлены іх сябры — японскія драпежнікі ля возера Хасан

Мы, прадстаўнікі братніх рэспублік, святкуючы 20-годдзе квітнеючай Беларусі, шлём братняе прывітанне народам Іспаніі і Кітая, гераічна адбіваючым нашэсце азвярэлых фашысцкіх драпежнікаў.

Беларускі народ, як і ўсе народы Совецкага Саюза, будзе і ў далейшым высока трымаць сцяг барацьбы за непарушнасць братняга саюза народаў СССР, за поўнае знішчэнне фашысцкага ахвосця, за ўмацаванне абароназдольнасці і недатыкальнасці граніц нашай вялікай радзімы, за поўную перамогу комунізма.

Няхай жыве шчаслівы беларускі народ і ўсе народы вялікага Совецкага Саюза!

Няхай жыве слаўная партыя Леніна—Сталіна!

Няхай жыве вялікі правадыр, наш родны, любімы Сталін!

Прамова тав. М. БАЖАНА

(Ад дэлегацыі УССР)

Дазвольце мне ў гэты светлы, урачысты і радасны дзень 20-годдзя БССР перадаць вам ад імя братняга ўкраінскага народа — рабочым, калгаснікам, інтэлігенцыі — шчырае, гарачае братняе прывітанне. **(Апладысменты).**

Разам з вялікім братам нашым — з магутным рускім народам, пры яго дапамозе і падтрыманні народы Украіны і Беларусі ў крывавай і цяжкой барацьбе набылі тое шчасце, тую радасць, тую сілу, якімі поўны цяпер нашы сэрцы. Разам з рускім народам мы — украінцы, беларусы, грузіны пад кіраўніцтвам большэвікоў, пад геніяльным кіраўніцтвам Леніна і Сталіна ішлі ў бai, білі і грамілі ўсіх тых, хто пасягаў на нашу свабоду, на нашу зямлю, на наша шчасце.

Мы білі нямецкіх інтэрвентаў, польскіх паноў, банды буржуазных нацыяналістаў, збіраўшыхся гандляваць нашым жыццём, банды трацкісцка-бухарынскіх шпіёнаў і здраднікаў. Мы іх білі, мы іх будзем біць да канца, смяртэльна, бязлітасна Няхай ведаюць ворагі, што наш сталінскі сцяг мы ўмеем несці толькі ўперад. Дзве рэспублікі—Украіна і Беларусь — сталі на заходняй граніцы совецкай зямлі несакрушальным стальным фарпостам. Няма сілы, якая змагла-б яго зламаць, няма сілы, якая змагла-б парушыць наша адзінства, нашу свяшчэнную дружбу народаў.

Украінскі і беларускі народы пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі дасягнулі нечуванай вышыні ў развіцці сваёй гаспадаркі, свайго дабрабыту, сваёй культуры. Украінская мова, як і беларуская, была ў цяжкія, цёмныя часы праклятага мінулага забаронена, літаратура праследвалася. Цяпер Украіна, кіруемая комуністычнай партыяй большэвікоў. Украіна на чале з верным вучнем Сталіна Нікітам Хрушчовым, дасягнула высокага росквіту, як і ўсе народы Совецкага Саюза.

Няхай жыве ВКП(б) — правадыр і арганізатар бліскучых перамог на ўсіх участках социялістычнага будаўніцтва!

Няхай жыве геніяльны правадыр і друг усіх народаў вялікі Сталін!

ПРЫВІТАННІ ПРАЦОЎНЫМ БССР

Ад Азербайджанскай ССР

Цэнтральны Камітэт КП(б) Азербайджана і Совет Народных Камісараў АзССР ад імя стаханаўцаў нафты і бавоўны, рабочых, калгаснікаў, совецкай інтэлігенцыі, усіх партыйных і непартыйных большэвікоў Азербайджана горача віншуюць працоўных Совецкай Беларусі з XX гадавінай утварэння Беларускай Совецкай Социялістычнай Рэспублікі.

Свята працоўных братняй Беларусі — гэта свята ўсіх народаў вялікага шматнацыянальнага Совецкага Саюза, моцна спаяных сталінскай дружбай. Назаўсёды выгнаўшы белапалякаў і германскіх акупантаў, разграміўшы і знішчыўшы асноўныя гнёзды ворагаў народа, гнусных здраднікаў радзімы — трацкісцка-бухарынскіх і буржуазна-нацыяналістычных агентаў фашызма, братні беларускі народ пад кіраўніцтвам роднай партыі Леніна — Сталіна, з дапамогай вялікага рускага народа, у рэзультаце выканання двух сталінскіх пяцігодак дабіўся бліскучых перамог ва ўсіх галінах социялістычнага будаўніцтва.

ЦК КП(б) Азербайджана і Соўнарком АзССР ад імя азербайджанскага народа выказваюць цвёрдую ўпэўненасць у тым, што народы Совецкай Беларусі будуць і надалей пільна ахоўваць рубяжы нашага Совецкага Саюза ад палпальшчыкаў вайны і пад кіраўніцтвам непераможнай большэвіцкай партыі, натхняемыя вялікім правадыром працоўных усяго свету — таварышам Сталіным, і далей пойдуць смела наперад, да поўнай перамогі комунізма.

Няхай жыве XX-годдзе Беларускай Совецкай Социялістычнай Рэспублікі!

Няхай жыве братні беларускі народ!

Няхай жыве вялікая сталінская дружба народаў!

Няхай жыве правадыр і арганізатар нашых перамог, любімы і вялікі Сталін!

САКРАТАР ЦК КП(б) АЗЕРБАЙДЖАНА БАГІРАЎ.

СТАРШЫНЯ СНК АЗЕРБАЙДЖАНА КУЛІЕЎ.

Ад Казахскай ССР

Совет Народных Камісараў Казахскай ССР і Цэнтральны Камітэт КП(б) Казахстана шлюць брацкае палкае прывітанне працоўным Совецкай Беларусі ў дзень слаўнага дваццацігоддзя Беларускай Совецкай Социялістычнай Рэспублікі.

Рабочыя і сяляне Беларусі, пад кіраўніцтвам партыі Леніна—Сталіна і пры дапамозе рускага пролетарыята, 20 год таму назад назаўсёды скінулі векавы гнёт царызма і стварылі социялістычную дзяржаву рабочых і сялян. Няўхільна праводзячы ў жыццё ленінска-сталінскую нацыянальную палітыку, працоўныя Совецкай Беларусі, разграміўшы трацкісцка-бухарынскіх і буржуазна-нацыяналістычных наймітаў фашызма, за гэтыя дваццаць год дасягнулі высокага ўзроўню развіцця народнай гаспадаркі і культуры і на аснове вялікай Сталінскай Канстытуцыі будуюць сваё новае, заможнае, культурнае і шчаслівае жыццё.

Працоўныя квітнеючага Совецкага Казахстана асабліва радасна адзначаюць шчаслівае дваццацігоддзе брацкай Беларускай рэспублікі! Казахскі народ, таксама як і працоўныя Совецкай Беларусі, у адзінай сям'і вялікага Совецкага Саюза пад сцягам Сталінскай Канстытуцыі ідзе ад перамогі да перамогі.

Совет Народных Камісараў і Цэнтральны Камітэт КП(б) Казахстана жадаюць шчасліваму беларускаму народу яшчэ большых поспехаў ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі рэспублікі і выражаюць упэўненасць, што Беларусь і надалей будзе магутным фарпостам на заходняй граніцы нашай социялістычнай радзімы.

Няхай жыве непарушная дружба народаў вялікага Совецкага Саюза — радзімы сусветнага пролетарыята!

Няхай жыве Беларуская Совецкая Социялістычная Рэспубліка!

Няхай жыве правадыр народаў, друг і настаўнік, наш любімы вялікі Сталін!

Старшыня Соўнаркома Казахскай ССР УНДАСЫНАЎ.

Сакратар КП(б) Казахстана СКВАРЦОЎ.



Народныя артысты БССР: А. К. Ільінскі, Л. П. Александроўская, В. О. Уладамірскі.

АБЯЦАЮ АПРАЎДАЦЬ ГАНАРОВАЕ ЗВАННЕ

Упартай працай над сабою, актыўным удзелам у творчай працы нашага Опернага тэатра і ў справе развіцця мастацтваў БССР, працай на карысць перамогшага социялізма, актыўным удзелам у грамадскім і палітычным жыцці тэатра, барацьбой за знішчэнне недахопаў у рабоце тэатра, дапамогай мастацкай самадзейнасці Чырвонай Арміі і гурткам самадзейнасці працоўных нашай краіны—адкажу я партыі Леніна —Сталіна і совецкаму ўраду за высокую, пачэсную ўзнагароду ў дні святкавання 20-годдзя БССР—наданне мне годнасці народнай артысткі Беларускай ССР.

Абяцаю усёй далейшай працай апраўдаць гэтае высокае ганаровае званне.

Народная артыстка БССР Л. П. АЛЕКСАНДРОЎСКАЯ.

Радасна тварыць у краіне квітнеючага социялізма

Якая радасць, якое шчасце жыць і тварыць у нашай краіне — краіне квітнеючага социялізма! Як радасна ведаць, што праца актора ў нашай краіне — пачэсная праца, якую глыбока паважае і высока цэніць совецкі народ.

У дзень XX гадавіны ўтварэння БССР комуністычная партыя і совецкі ўрад удастоілі мяне высокай узнагароды, прысвоіўшы званне народнага артыста БССР

Званне народнага артыста рэспублікі абавязвае яшчэ больш і лепш працаваць. Я абяцаю ўсю сваю сілу і энергію, усе творчыя здольнасці аддаць на стварэнне высокамастацкіх вобразаў, адлюстроўваючых нашу вялікую сталінскую эпоху, аддаць на карысць далейшага росквіту нашага социялістычнага мастацтва, на карысць любімай маці-радзімы.

Дзякую комуністычнай партыі і совецкаму ўраду за аказаны вялікі гонар.

Дзякую роднаму Сталіну — бацьку і лепшаму другу беларускага народа, тварцу нашых социялістычных перамог, тварцу сонечнага росквіту нашага мастацтва.

Народны артыст БССР В. О. УЛАДАМІРСКІ.

Нас выхавала партыя Леніна—Сталіна

У радасныя дні святкавання дваццацігоддзя БССР творчыя работнікі тэатраў Совецкай Беларусі. у тым ліку пяць актораў Віцебскага тэатра, атрымалі ад партыі і ўрада высокую ўзнагароду — годнасць народных і заслужаных артыстаў рэспублікі.

Гэта высокая ўзнагарода — новае сведчанне таго, як любоўна з якімі бацькоўскімі клопатамі адносіцца да нас, работнікаў мастацтва, вялікая партыя Леніна — Сталіна.

Атрыманыя намі ўзнагароды — гэта высокая ацэнка работы нашага тэатра, яго творчага росту. Гэты рост забяспечыла комуністычная партыя, якая, разграміўшы ворагаў на ўсіх франтах социялістычнага будаўніцтва, у тым ліку і на фронце мастацтваў накіравала нас на адзіна правільны шлях развіцця сапраўднага мастацтва, — на шлях социялістычнага рэалізма. Толькі дзякуючы клопатам комуністычнай партыі і совецкага ўрада вырас наш тэатр і зараз займае адно з перадавых месц у социялістычным мастацтве нашай квітнеючай рэспублікі.

Наш тэатр мае ўсе магчымасці для далейшага і яшчэ больш хуткага творчага росту. І ў далейшым мы будзем працаваць так, каб дасягаць усё новых перамог у рабоце тэатра і гэтым узбагачаць социялістычнае мастацтва шчаслівага беларускага народа, які радасна жыве і творыць пад сонцам Сталінскай Канстытуцыі.

Народны артыст БССР А. К. ІЛЬІНСКІ.

УКАЗ
Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР
АБ ТЭКСЦЕ ВАЕННАЙ ПРЫСЯГІ РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

У адпаведнасці з Канстытуцыяй Саюза Совецкіх Социялістычных Рэспублік, зацвердзіць наступны тэкст ваеннай прысягі для Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі:

«Я, грамадзянін Саюза Совецкіх Социялістычных Рэспублік, уступаючы ў рады Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, прымаю прысягу і ўрачыста клянуся быць чэсным, храбрым, дысцыплінаваным, пільным байцом, строга захоўваць ваенную і дзяржаўную тайну, беспярэкаслоўна выконваць усе воінскія статуты і загады камандзіраў, камісараў і начальнікаў.

Я клянуся добрасумленна вывучаць ваенную справу, усямерна берагчы ваенную і народную маёмасць і да апошняга дыхання быць адданым свайму Народу, сваёй Совецкай Радзіме і Рабоча-Сялянскаму Ураду.

Я заўсёды гатоў па загаду Рабоча-Сялянскага Урада выступіць на абарону маёй Радзімы—Саюза Совецкіх Социялістычных Рэспублік і, як воін Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, я клянуся абараняць яе мужна, умела, з дастоінствам і гонарам, не шкадуючы сваёй крыві і самога жыцця для дасягнення поўнай перамогі над ворагамі.

Калі-ж па злому умыслу я парушу гэту маю ўрачыстую прысягу, то няхай мяне пасцігне суровая кара совецкага закона, усеагульная нянавісць і прэзрэнне працоўных».

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль. 3 студзеня 1939 года.

УКАЗ
Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР
АБ ТЭКСЦЕ ВАЕННАЙ ПРЫСЯГІ РАБОЧА-СЯЛЯНСКАГА ВАЕННА-МАРСКОГА ФЛОТА

У адпаведнасці з Канстытуцыяй Саюза Совецкіх Социялістычных Рэспублік, зацвердзіць наступны тэкст ваеннай прысягі для Рабоча-Сялянскага Ваенна-Марскога Флота:

«Я, грамадзянін Саюза Совецкіх Социялістычных Рэспублік, уступаючы ў рады Рабоча-Сялянскага Ваенна-Марскога Флота, прымаю прысягу і ўрачыста клянуся быць чэсным, храбрым, дысцыплінаваным, пільным байцом, строга захоўваць ваенную і дзяржаўную тайну, беспярэкаслоўна выконваць усе воінскія статуты і загады камандзіраў, камісараў і начальнікаў.

Я клянуся добрасумленна вывучаць ваенную справу, усямерна берагчы ваенную і народную маёмасць і да апошняга дыхання быць адданым свайму Народу, сваёй Совецкай Радзіме і Рабоча-Сялянскаму Ураду.

Я заўсёды гатоў па загаду Рабоча-Сялянскага Урада выступіць на абарону маёй Радзімы—Саюза Совецкіх Социялістычных Рэспублік і, як воін Рабоча-Сялянскага Ваенна Марскога Флота, я клянуся абараняць яе мужна, умела, з дастоінствам і гонарам, не шкадуючы сваёй крыві і самога жыцця для дасягнення поўнай перамогі над ворагамі.

Калі-ж па злому ўмыслу я парушу гэту маю ўрачыстую прысягу, то няхай мяне пасцігне суровая кара совецкага закона, усеагульная нянавісць і прэзрэнне працоўных».

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М КАЛІНІН.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль. 3 студзеня 1939 года.

УКАЗ
Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР
АБ ПРЫВЯДЗЕННІ ДА ПРЫСЯГІ РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ, РАБОЧА-СЯЛЯНСКАГА ВАЕННА-МАРСКОГА ФЛОТА І ВОЙСК ПАГРАНІЧНАЙ АХОВЫ

Прывесці да прысягі ўсю Рабоча-Сялянскую Чырвоную Армію, Рабоча-Сялянскі Ваенна-Марскі Флот і Войскі Пагранічнай Аховы 23-га лютага 1939 года — у дзень 21-й гадавіны Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН.

Масква, Крэмль. 3 студзеня 1939 г.

УЗНАГАРОДЖАННЕ РАБОТНІКАЎ ПРАМЫСЛОВАСЦІ, ТРАНСПАРТУ, СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ, НАВУКІ, КУЛЬТУРЫ, МАСТАЦТВА, ЧЫРВОНААРМЕЙЦАЎ, КАМАНДЗІРАЎ І ПАЛІТРАБОТНІКАЎ ПАГРАНІЧНЫХ ВОЙСК НКВД БССР

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР у азнаменаванне 20-годдзя БССР за выдатныя поспехі ў галіне социялістычнага будаўніцтва, узняцця прадукцыйнасці працы, разгортвання стаханаўскага руху, умацавання абароназдольнасці краіны і абароны дзяржаўнай граніцы ўзнагароджаны работнікі прамысловасці, транспарту, сельскай гаспадаркі, навукі, культуры, мастацтва, чырвонаармейцы, камандзіры і палітработнікі пагранічных войск НКВД БССР. **Ганаровай граматай Вярхоўнага Совета БССР** узнагароджана 66 чалавек, **Граматай Вярхоўнага Совета БССР** узнагароджана 222 чал.

У ліку ўзнагароджаных **Ганаровай граматай Вярхоўнага Совета БССР** таварышы **Паніна** Ніна Іванаўна — прафесар Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі, **Шуман** Еўгенія Раманаўна — настаўніца Віцебскай музычнай школы, **Фрыдмо** Ісак Эльевіч — музыкант аркестра Беларускага дзяржаўнага тэатра оперы і балета, **Міровіч** Еўсцігней Афінагенавіч — мастацкі кіраўнік Тэатра юнага гледача, **Мальнова** Вера Міхайлаўна — артыстка Беларускага дзяржаўнага тэатра оперы і балета, **Друкер** Соф'я Юльеўна — артыстка Беларускага дзяржаўнага тэатра оперы і балета, **Пацехін** Васілій Васільевіч — артыст Палескага абласнога тэатра, **Корш-Саблін** Уладзімір Уладзіміравіч — рэжысёр кіностудыі «Совецкая Беларусь», **Тарыч** Юрый Віктаравіч — рэжысёр кіностудыі «Совецкая Беларусь», **Аненскі** Ісак Меeравіч — рэжысёр кіностудыі «Совецкая Беларусь», **Свярдлова** Роза Міронаўна — артыстка кіностудыі «Совецкая Беларусь», **Шлюглейт** Давід Абрамавіч — аператар кіностудыі «Совецкая Беларусь», **Первунін** Всевалад Васільевіч — мастак кіностудыі «Совецкая Беларусь». **Кругер** Якаў Маркавіч — мастак, **Зайцаў** Еўгеній Аляксандравіч — мастак, **Волкаў** Валянцін Віктаравіч — мастак, **Чуркін** Нікалай Нікалаевіч — кампазітар, **Любан** Ісак Ісаакавіч — кампазітар, **Шчэглоў** Нікалай Нікалаевіч — кампазітар, **Туранкоў** Аляксей Еўлампіевіч—кампазітар.

У ліку ўзнагароджаных **Граматай Вярхоўнага Совета БССР** таварышы **Зісман** Лазар Мордухавіч — дырэктар Магілеўскага музычнага вучылішча, **Жыгальскі** Іван Якаўлевіч — кіномеханік аўтагукавой кінопераcоўкі Глускага раёна, **Собалеў** Канстанцін Васільевіч — кіномеханік Белдзяржкіно, **Геллер** Шэвель Моўшавіч — кіномеханік Белдзяржкіно, **Волкаў** Грыгорый Васільевіч — грымёр Беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатра, **Пржэбытко** Міхаіл Іванавіч — машыніст сцэны Беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатра. **Кіпніс** Гідалій Якаўлевіч — мастак Яўрэйскага дзяржаўнага тэатра БССР, **Астахаў** Аляксандр Осіпавіч — актор Тэатра музкамедыі БССР, **Вольпіна** Песя Ісакаўна — артыстка Яўрэйскага дзяржаўнага тэатра БССР, **Палічынецкі** Юрый Грыгор'евіч — рэжысёр Тэатра юнага гледача.

***

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР у азнаменаванне 20-годдзя БССР за выдатныя поспехі ў галіне социялістычнага будаўніцтва **Ганаровай граматай Вярхоўнага Совета БССР** узнагароджаны таварышы:

ВАЛЧОК Ісідар Максімавіч — дацэнт Беларускага Дзяржаўнага Універсітэта, КАЛІНОЎСКІ Валерый Валерыянавіч — артыст Беларускага дзяржаўнага тэатра оперы і балета, ТРУС Ан[illegible]толій Міхайлавіч — артыст Віцебска[illegible] беларускага дзяржаўнага драматыч[illegible]га тэатра, БАГАТЫРОЎ Анатолій [illegible]сільевіч — кампазітар, ЦІКОЦКІ [illegible]геній Карлавіч — кампазітар, М[illegible] Ілья Аляксандравіч — галоўны д[illegible]жор Беларускай дзяржаўнай філа[illegible]ніі, ШНЕЙДЭРМАН Марк Эмануіла[illegible] дырыжор аркестра Беларускага [illegible]жаўнага тэатра оперы і балета, Ш[illegible]РА Еўгеній Веньямінавіч — апе[illegible] кіностудыі «Совецкая Беларусь» [illegible]шыя работнікі культуры, прамысл[illegible]ці і сельскай гаспадаркі — усяг[illegible] чалавек.

Граматай Вярхоўнага Совета узнагароджаны 2 чалавекі.

Адказны рэдактар І. ГУР[illegible]

Менск, друкарня «Звязды». Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць адзін раз у пяцідзёнку. Уп. Галоўлітбела № К—714.